Родная газета на родной мове

# ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я  Г А З Е Т А

2 КРАСАВІКА 2009 г.
ЧАЦВЕР
№ 61
(26419)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

## Дарагія беларусы і расіяне!

Сардэчна віншую вас з Днём яднання народаў Беларусі і Расіі — святам, якое ўжо становіцца нашай агульнай традыцыяй.

Узяты намі курс на выбудоўванне саюзніцкіх адносінаў заснаваны на натуральным імкненні беларусаў і расіян мірна жыць і ўзаемавыгадна супрацоўнічаць у рамках адзінай эканамічнай, навукова-тэхнічнай і культурнай прасторы.

Трынаццаць гадоў — невялікі перыяд для любога інтэграцыйнага аб'яднання. Аднак за гэты кароткі прамежак часу Беларусь і Расія зрабілі істотны крок да дасягнення галоўнай мэты — стварэння неабходных умоў для ўстойлівага развіцця нашых краін, павышэння дабрабыту і ўзроўню жыцця народаў.

Сёння практычна вырашаны пытанні, звязаныя з забеспячэннем роўных правоў беларусаў і расіян у сферах працаўладкавання і аплаты працы, адукацыі, медыцыны, выбару месца знаходжання і жыхарства.

Беларусь і Расія з адзіных пазіцый выступаюць на міжнароднай арэне, сумесна ўмацоўваюць абараназдольнасць і бяспеку Саюзнай дзяржавы. Актыўна развіваецца партнёрства ў галіне навукі, культуры, спорту і турызму.

Дасягнуты высокі ўзровень узаемавыгаднай прамысловай і навукова-тэхнічнай кааперацыі, мацнеюць міжрэгіянальныя кантакты. Ва ўмовах сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу намі выпрацаваны механізм узгодненых дзеянняў па мінімізацыі яго ўплыву на эканомікі дзвюх краін.

У бліжэйшых планах — больш хуткае завяршэнне работ па выраўноўванні ўмоў для суб'ектаў гаспадарання, стварэнні рэальнага мытнага саюза без якіх-небудзь абмежаванняў і бар'ераў.

Дарагія сябры!

Толькі цеснае супрацоўніцтва ва ўсіх галінах і сумеснае выкарыстанне матэрыяльных і інтэлектуальных рэсурсаў дадуць магчымасць надаць дадатковы імпульс саюзнаму будаўніцтву, змогуць гарантаваць надзейную абарону правоў і інтарэсаў беларусаў і расіян.

У гэты святочны для ўсіх нас дзень ад усёй душы жадаю вам моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту. Няхай у вашых дамах заўсёды пануюць мір і згода!

**Старшыня Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы,**
**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## *Віншаванні з Днём яднання народаў Беларусі і Расіі*

**Старшыня Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Дзмітрыя Мядзведзева і шэраг расійскіх палітычных і грамадскіх дзеячаў з Днём яднання народаў Беларусі і Расіі.**

З нагоды свята пасланні ад імя Прэзідэнта Беларусі накіраваны Старшыні Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы, Старшыні Урада Расіі Уладзіміру Пуціну, Старшыні Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расіі Сяргею Міронаву, Старшыні Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, Старшыні Дзяржаўнай Думы Федэральнага Сходу Барысу Грызлову, Патрыярху Маскоўскаму і ўсяе Русі Кірылу.

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў таксама кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Сяргея Нарышкіна, Дзяржаўнага сакратара Саюзнай дзяржавы Паўла Барадзіна, губернатара Маскоўскай вобласці Барыса Громава, мэра Масквы Юрыя Лужкова, прэзідэнта Гандлёва-прамысловай палаты Расіі Яўгена Прымакова.

У віншаванні расійскаму Прэзідэнту, у прыватнасці, гаворыцца: «Шматвяковае братэрства і агульнае гістарычнае мінулае служаць трывалай асновай для развіцця эфектыўнага беларуска-расійскага супрацоўніцтва па ўсіх напрамках».

Аляксандр Лукашэнка выказаў удзячнасць Дзмітрыю Мядзведзеву за ўсямерную падтрымку інтэграцыйных працэсаў паміж дзвюма краінамі. «Перакананы, што саюзныя адносіны Беларусі і Расіі будуць нязменна ўмацоўвацца на карысць народаў дзвюх краін», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

Прамая лінія

## УСЁ ПРА РАЗМЕРКАВАННЕ

На ўсе пытанні, якія датычацца забеспячэння маладых людзей першым працоўным месцам і працы па размеркаванні, вам адкажуць **старшыня Рэспубліканскага савета старшыняў прафсаюзных камітэтаў навучэнскай моладзі пры Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, намеснік старшыні ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Раман ДАПІРА** і **галоўны прававы інспектар працы ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Ларыса МАНЮК,** з якімі «Звязда» арганізуе заочную «прамую» лінію.

**З пытаннямі можна звяртацца ў рэдакцыю па нумары (017) 287 17 41 (Надзея НІКАЛАЕВА).**

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 2.04.2009 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША | 2 835,00 |
| ▼ 1 еўра | 3 736,25 |
| 1 латвійскі лат | 5 269,03 |
| 1 літоўскі літ | 1 082,33 |
| 1 чэшская крона | 136,72 |
| 1 польскі злоты | 804,03 |
| ▲ 1 расійскі рубель | 83,52 |
| 1 украінская грыўня | 352,17 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 33,9456 |
| 10 UAH | 42,1684 |
| 1000 BYR | 11,9949 |
| EUR | 44,7912 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

## ПЯЦЬ ДА АДНАГО!

Зборная Беларусі па футболе ў гасцях супраць каманды Казахстана правяла свой першы матч у новым сезоне адборачнага турніру да чэмпіянату свету 2010 года. Прайграючы пасля першага тайма, беларусы ўсё ж праявілі характар і перамаглі гаспадароў з лікам 5:1 (Аляксандр Глеб (48 хвіліна), Цімафей Калачоў (53, 63), Ігар Стасевіч (57) і Віталь Радзівонаў (88). У гаспадароў вызначыўся Рынат Абдулін (10).

**Ул. інф.**

## Затрымана службовая асоба УДФР КДК

**У Мінску на мінулым тыдні быў затрыманы начальнік аддзялення арганізацыі аператыўна-пошукавай дзейнасці ўпраўлення дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК па Мінскай вобласці і Мінску.**

Як адзначыў начальнік упраўлення па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі ў стратэгічных напрамках УУС Мін-аблвыканкама Аляксандр Радаеў, затрымалі гэтага супрацоўніка УДФР каля будынка УДФР па Мінскай вобласці і Мінску па вуліцы Петруся Броўкі пры атрыманні 8 тысяч долараў ЗША. Падазраецца ж ён у тым, што ўзяў гэтыя грошы за ўчыненне заведама незаконных дзеянняў па вырашэнні пытання аб спыненні крымінальнага пераследу ў дачыненні да двух сталічных бізнэсменаў, якія займаюцца будаўнічым бізнэсам. Узбуджана крымінальная справа.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## Сацыяльная падтрымка: каму і на якіх умовах?

— усе гэта стане тэмай «прамой лініі» газеты «Звязда» з удзелам **начальніка ўпраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянціны Пятроўны СЯРГЕЕВАЙ, начальніка аддзела па справах інвалідаў Рыты Валянцінаўны СУШКО і начальніка аддзела па справах ветэранаў Івана Пятровіча НАГІБІНА.**

*«Прамая лінія» пройдзе 14 красавіка з 11 да 12 гадзін па рэдакцыйных тэлефонах (8 017) 292 38 21 і 292 38 92. Папярэдне пытанні можна пакінуць па нумары (8 017) 287 17 57.*

ISSN 1990 - 763X

# АДПАЧЫЦЬ АД КРЫЗІСУ

## ПЛАНАВАЦЬ, КАБ МЕЦЬ... ПУЦЁЎКУ

**Традыцыйна адна з «прыкмет» сярэдзіны вясны — думкі пра адпачынак. Прычым не сакрэт, што апошнім часам яго «айчынныя» варыянты разглядаюцца ўсё часцей. Якім жа будзе кошт аздараўлення сёлета, як будуць размяркоўвацца «датацыйныя» пуцёўкі, ці з'явіцца праблема дэфіцыту месцаў у беларускіх санаторыях і як з гэтай праблемай можна «змагацца»? Разабрацца з сітуацыяй мы паспрабуем з дапамогай дырэктара Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва Мікалая Уладзіміравіча МАЗУРА.**

### Якасць вабіць іншаземцаў

З 2005 года колькасць санаторна-курортных устаноў скарацілася са 173 да 101. Разам з тым больш строгія падыходы да якасці адпачынку далі свой вынік. Рэальна ў краіне налічваецца каля двух дзясяткаў здраўніц па-сапраўднаму еўрапейскага ўзроўню. Прычым мадэрнізацыя базы айчынных санаторыяў не спыняецца — толькі летась у яе развіццё было ўкладзена 92 млрд рублёў. Дарэчы, цікавы факт. Нягледзячы на адсутнасць мора і гор, сёння Беларусь усур'ёз прэтэндуе на статус «курортнай дзяржавы» з атрыманнем адпаведнага міжнароднага сертыфіката FEMTEC. Аргумент нумар адзін на карысць гэтага — добрая экалогія, чыстая пітная вада, наяўнасць 120 радовішчаў лячэбнай гразі і каля 60 «распрацаваных» мінеральных крыніц. А аргумент нумар два — тая ж якасць паслуг.

— Паляпшэнне якасці санаторных паслуг пацвярджаецца ростам попыту, — кажа Мікалай Мазур. — Калі нядаўна сярэдні ўзровень запаўнення нашых здраўніц на працягу года складаў прыкладна 80%, то летась ён павялічыўся да 95%. Але ці не галоўнае: даводзіцца канстатаваць значнае павышэнне цікавасці да адпачынку ў Беларусі з боку замежных грамадзян. Іх прывабліваюць магчымасць атрымання комплексу медыцынскіх паслуг, добрае харчаванне, памяркоўнасць нашых грамадзян, бяспека і, зразумела, параўнальна нізкія цэны.

85% замежных наведвальнікаў айчынных здраўніц складаюць расіяне, таксама ў тройцы лідараў — рускамоўныя грамадзяне краін Балтыі і Ізраіля. Але не толькі — прыязджаюць палякі і немцы. Колькасць іншаземцаў увесь час узрастае. У 2005 годзе ў айчынных санаторыях адпачылі 12 тыс. чалавек з-за мяжы Беларусі, 2006 годзе — 28 тыс., 2007 годзе — 51,3 тыс., летась — 83,2 тыс. Прычым насуперак змрочным прагнозам наконт перспектыў турыстычнага рынку падчас сусветнага эканамічнага крызісу, тэндэнцыя захоўваецца. За студзень-люты сёлета спецыяльна на адпачынак у Беларусь прыехалі 11 тыс. чалавек, тады як за такі ж час летась — толькі 8 тысяч.

— Папулярнасць беларускіх здраўніц сярод іншаземцаў можна толькі вітаць, — зазначае Мікалай Мазур. — Бо, зразумела, што адначасова даводзіцца казаць і аб росце экспарту паслуг, і аб перспектывах стварэння новых працоўных месцаў. Да таго ж не будзем забываць: цэны на пуцёўкі для грамадзян іншых краін вышэйшыя. А ў сваю чаргу дзякуючы гэтаму з'яўляюцца магчымасці развіваць інфраструктуру адпачынку і набываць новае абсталяванне.

І ўсё ж таксама не сакрэт: павелічэнне прытоку іншаземцаў «супала»... з абвастрэннем праблемы дэфіцыту пуцёвак для грамадзян Беларусі. Прычым асабліва востра ён адчуваўся летам мінулага года.

### Як змагацца з дэфіцытам?

Агульны «рэзерв» беларускіх здраўніц складае 25 тысяч месцаў у заезд. Пры гэтым гаворкі аб будаўніцтве новых санаторыяў сёння не ідзе. Дзе выйсце?

— Можна казаць аб некалькіх напрамках, — адзначае Мікалай Мазур. — Па-першае, сёння ідзе рэканструкцыя некалькіх здраўніц з адначасовым пашырэннем іх умяшчальнасці, бліжэйшым часам толькі ў прафсаюзных санаторыях павінна з'явіцца каля 500 новых месцаў. Па-другое, чакаецца, што да «высокага сезона» атэстацыю на статус санаторыя пройдзе шэраг цяперашніх аздараўленчых цэнтраў — атрыманне такога статусу стане вынікам паляпшэння якасці паслуг. І па-трэцяе. З улікам таго, што асабліва востра праблема стаіць у гарадах, мы пашыраем практыку прадастаўлення курсовак — да прыкладу, у мінскую водагразелячэбніцу.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## ТУРЫСТЫЧНЫ КІРМАШ Б'Е РЭКОРДЫ ПА НАВЕДВАЛЬНІКАХ

**Учора ў Мінску адкрыўся дванаццаты Міжнародны кірмаш турыстычных паслуг «Адпачынак-2009». Больш за 140 удзельнікаў, каля 70 стэндаў, прадстаўнікі 16 краін свету, але самае цікавае і нечаканае — шквал наведвальнікаў, колькасць якіх яшчэ не падлічана, але па назіраннях арганізатараў, значна перавышала колькасць наведвальнікаў падобных выстаў у дакрызісныя часы. Чым гэта тлумачыцца? Першае, што прыходзіць у галаву, — народ стаміўся ад стрэсу, які выклікаюць паведамленні СМІ пра крызіс і пра тое, што горшыя часы яшчэ наперадзе. Другое, людзі сталіся сачыць за ваганнем курсу валют і вырашыліся перавтварыць грошы з прадмета клопату ў падставу для задавальнення. Трэцяе — выстава-кірмаш сведчыць, што грошы ў людзей ёсць, можа не столькі, каб укласці ў нерухомую альбо рухомую маёмасць, але, ва ўсякім разе, столькі — каб наблізіць здзяйсненне мары апошніх 5 халодных месяцаў.**

Кірмаш «Адпачынак», які праводзіць Нацыянальны выставачны цэнтр «БелЭкспа» Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь сумесна з Міністэрствам спорту і турызму дапамагае наведвальнікам вырашыць праблему будучага водпуску. Тут сабраны ўвесь спектр прапаноў рынку турыстычных паслуг: вандроўкі, экскурсійныя праграмы, транспартныя паслугі, гасцінічны сэрвіс, тавары для адпачынку і іншае.

— У Беларусі развіццё турызму — складнік сацыяльнай палітыкі, — сказаў у вітальным слове гасцям і ўдзельнікам кірмашу **міністр спорту і турызму Аляксандр ГРЫГАРАЎ.** — Кіраўніком дзяржавы гэты год аб'яўлены Годам роднай зямлі. У нашай багатай на традыцыі краіне створаны спрыяльныя ўмовы для развіцця ўсіх відаў турызму, і ў першую чаргу ўязнога і ўнутранага.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

Минский городской центр недвижимости

## УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

**29 апреля 2009 г. проводит открытый аукцион № 05-Сф-09 по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь**

**Вид аукциона:** открытый (на повышение цены продажи).
**Предмет аукциона:** право частной собственности на земельный участок.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.
На торги выставляются 4 земельных участка, расположенных в районе малоэтажной застройки в границах пр. Победителей — проезда Дрозды — р. Свислочь (застройка жилого квартала № 11) для строительства одноквартирных (блокированных) жилых домов:

| Лот № | № участка по генплану | Кадастровый номер земельного участка | Площадь земельного участка, га | Начальная цена, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций и сооружений | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2.2 | 500000000007004533 | 0,0804 | 326 792 120 | 32 679 220 | Участок свободен от застройки, но имеется несколько деревьев | 2 630 051 |
| 2 | 2.3 | 500000000007004535 | 0,0707 | 287 365 710 | 28 736 580 | Участок свободен от застройки, но имеется несколько деревьев | 2 585 046 |
| 3 | 4.1 | 500000000007004538 | 0,0748 | 304 030 480 | 30 403 050 | Участок свободен от застройки, но имеется несколько деревьев | 2 585 046 |
| 4 | 4.2 | 500000000007004539 | 0,0547 | 222 332 450 | 22 233 250 | Участок свободен от застройки и насаждений | 2 585 046 |

Земельные участки находятся в водоохранной зоне водных объектов г. Минска.

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

**Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона:** своевременное внесение победителем аукциона платы за соответствующие земельные участки; возмещение им расходов, связанных с подготовкой и проведением аукциона и формированием этих земельных участков, учитывая их государственную регистрацию.

**Справочно:** - в течение 2-х месяцев после принятия Минским горисполкомом решения о предоставлении победителю аукциона земельных участков соответствующие имущественные права на них должны быть зарегистрированы в РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;

- техническая документация и разрешение на строительство жилого дома получается владельцами земельных участков в установленном порядке;

- победители аукциона заключают с Минским городским исполнительным комитетом договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений);

- собственникам земельных участков необходимо завершить возведение одноквартирного (блокированного) жилого дома не позднее одного года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации прав на земельный участок.

Аукцион состоится 29 апреля 2009 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**внести задаток** в размере 10 % от начальной цены заявленного лота (лота с наибольшей стоимостью – в случае участия в торгах по нескольким лотам), перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04901, получатель – Финансовое управление Мингорисполкома;

**представить в адрес УП «Минский городской центр недвижимости» следующие документы:**

заявление на участие в аукционе установленной формы;

заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка в установленном размере;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, в соответствии с которым участник аукциона, победивший в торгах, либо которому земельный участок предоставляется в случаях, предусмотренных законодательством Республики Беларусь, обязан произвести оплату организатору аукциона за его организацию и проведение в размере 1 % от цены продажи соответствующего земельного участка.

дополнительно представляется:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане и представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов** для участия в аукционе начинается с **10.00 03 апреля 2009 года** и заканчивается в **17.00 20 апреля 2009 года.**

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому выставленному лоту признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победители торгов (участники аукциона, которым земельные участки предоставляются в отдельных случаях, предусмотренных законодательством) в течение 10 рабочих дней со дня принятия Минским горисполкомом решений о предоставлении им соответствующих земельных участков обязаны:

внести плату за земельный участок;

возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

произвести оплату организатору торгов за подготовку и проведение аукциона, включающую возмещение расходов, связанных с подготовкой и проведением аукциона, в размере 1 процента от цены продажи земельного участка;

выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком выдает выписку из решения о предоставлении земельного участка в частную собственность.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

В дни и время, указанные в объявлении, размещаемом на информационном стенде (фойе офиса УП «Минский городской центр недвижимости»: г. Минск, ул. К. Маркса, 39), организатором торгов предоставляется транспорт для обеспечения осмотра земельных участков желающими принять участие в аукционе.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 4, 6.

**Контактные телефоны + 375 (17) 226 16 72, + 375 (17) 227 40 22.**

**Дополнительная информация о выставленных на аукцион участках, а также условия участия в торгах и бланки требуемых документов размещены на официальном сайте организатора торгов www.mgcn.by.**

СТРАХОВАЯ КОМПАНИЯ ПРОМТРАНСИНВЕСТ

## ГОДОВОЙ БАЛАНС за 2008 год

## ЗАСО «ПРОМТРАНСИНВЕСТ»

**220039, г. Минск, ул. Воронянского, 7А.**
**Тел. (017) 222 75 49**

УСПЕШНОЙ РАБОТЫ 16 ЛЕТ НА СТРАХОВОМ РЫНКЕ

млн.руб.

| АКТИВ | | ПАССИВ | |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **Основные средства** | **7 589** | **Источники собственных средств, всего** | **10 555** |
| **Нематериальные активы** | **22** | в том числе: | |
| **Финансовые вложения, всего** | | уставный фонд | 4 621 |
| в том числе: | | резервный фонд | 311 |
| инвестиции в дочерние общества | | добавочный фонд | 4 441 |
| инвестиции в другие организации | | фонд накопления | |
| облигации и другие долговые обязательства | | фонд потребления | |
| прочие финансовые вложения | | целевое финансирование | |
| **Доля перестраховщиков в страховых резервах** | **5 032** | нераспределенная прибыль прошлых лет | |
| **Дебиторы, всего** | **2 360** | нераспределенная прибыль отчетного года | 1 182 |
| в том числе: | | **Страховые резервы и фонды, всего** | **21 193** |
| дебиторская задолженность по операциям страхования, сострахования и перестрахования | 194 | в том числе: | |
| | | страховые резервы | 20 261 |
| депо премий по рискам, принятым в перестрахование | | фонд предупредительных (превентивных) мероприятий | 908 |
| | | гарантийные фонды | 24 |
| дебиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования) | 2 166 | **Кредиторы, всего** | **2 340** |
| | | в том числе: | |
| **Прочие активы, всего** | **20 008** | кредиторская задолженность по операциям страхования, сострахования | 269 |
| в том числе: | | кредиторская задолженность по операциям перестрахования | |
| незавершенное строительство | 485 | депо премий по рискам, переданным в перестрахование | |
| материальные ценности и затраты | 569 | заемные средства | 1 037 |
| денежные средства | 18 951 | кредиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования) | 1 034 |
| собственные акции (доли) | 3 | | |
| прочие активы | | **Прочие пассивы** | **923** |
| Непокрытые убытки прошлых лет | | | |
| Непокрытые убытки отчетного года | | | |
| **БАЛАНС** | **35 011** | **БАЛАНС** | **35 011** |

## ОТЧЕТ О ФИНАНСОВЫХ РЕЗУЛЬТАТАХ ЗАСО «ПРОМТРАНСИНВЕСТ» ЗА 2008 ГОД

млн.руб

| НАИМЕНОВАНИЕ ПОКАЗАТЕЛЯ | Код строки | За отчетный период |
|---|---|---|
| **1. Страхование жизни** | | |
| Страховые взносы (премии) | 010 | |
| Страховые выплаты | 020 | |
| Изменение резерва по страхованию жизни ( + или - ) | 030 | |
| Отчисления в гарантийный фонд | 040 | |
| Расходы на ведение дела | 041 | |
| **Результат от операций по страхованию жизни ( + или - )** | 050 | |
| **2. Страхование иное, чем страхование жизни** | | |
| Страховые взносы (премии) — нетто перестрахование | 064 | 39 347 |
| Изменение резерва незаработанной премии — нетто перестрахование ( + или - ) | 067 | -3 003 |
| Оплаченные убытки (страховые выплаты) — нетто перестрахование | 082 | 18 409 |
| Изменение резервов убытков — нетто перестрахование ( + или - ) | 092 | -293 |
| Изменение других технических резервов ( + или - ) | 100 | |
| Изменение иных страховых резервов ( + или - ) | 105 | |
| Отчисления в фонд предупредительных (превентивных) мероприятий и гарантийные фонды | 110 | 2 358 |
| Расходы на ведение дела | 120 | 14 576 |
| Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование | 121 | 596 |
| Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, принятым в перестрахование | 122 | 201 |
| **Результат от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни ( + или - )** | 130 | 1 103 |
| **3. Прочие доходы и расходы, не отнесенные в разделы 1 и 2** | | |
| Операционные доходы | 140 | 7 762 |
| Операционные расходы | 145 | 5 305 |
| Внереализационные доходы | 150 | 1 003 |
| Внереализационные расходы | 155 | 1 186 |
| Финансовый результат | 157 | 3 377 |
| Использовано прибыли | 158 | 2 195 |
| Нераспределенная прибыль (убытки) отчетного периода ( + или - ) | 170 | 1 182 |

В 2008 году компания сотрудничала с аудитором индивидуальным предпринимателем Ткач Светланой Ивановной. Юридический адрес: 220022, г. Минск, ул. Чайлытко, д. 20, кв. 64. Специальное разрешение (лицензия) на право осуществления аудиторской деятельности № 02200/0495395 от 05.01.2009 г. выдано Министерством финансов Республики Беларусь со сроком действия по 02.02.2014 г. УНП 100990426. Свидетельство о государственной регистрации от 24.08.2000 г. № 955 выдано Минским горисполкомом.

**Аудиторское заключение:** бухгалтерская (финансовая) отчетность ЗАСО «Промтрансинвест», сформированная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ЗАСО «Промтрансинвест» на 1 января 2009 года и результаты его финансово-хозяйственной деятельности за 2008 год, при этом совершенные ЗАСО «Промтрансинвест» финансовые (хозяйственные) операции соответствуют законодательству.

УНП 100357923

# Падзяка Прэзідэнта

Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб'яўлена Надзвычайнаму і Паўнамоцнаму Паслу Беларусі ў Кітайскай Народнай Рэспубліцы Анатолю Тозіку. Такой высокай ацэнкі кіраўніка дзяржавы дыпламат удастоены за плённую работу ў галіне знешняй палітыкі, узорнае выкананне службовых абавязкаў.

Падзяка Прэзідэнта Беларусі аб'яўлена таксама капітану Сяргею Клімовічу, капітану ўнутранай службы Уладзіміру Ефанкову, падпалкоўніку ўнутранай службы Івану Паляводзе, старшаму лейтэнанту Міхаілу Тарану і старшаму лейтэнанту ўнутранай службы Сяргею Шчарбатых за дасягненне высокіх вынікаў у аператыўна-службовай дзейнасці.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Ва Урадзе

# «Нам па сілах пераадолець цяжкасці, прынесеныя звонку»

**Беларусь і Ніжагародская вобласць маюць збалансаваны тавараабарот, які летась перавысіў 600 мільёнаў долараў ЗША. Пра гэта заявіў учора ў Мінску прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі на сустрэчы з губернатарам Ніжагародскай вобласці Валерыем Шанцавым.**

«Нам, хто займаецца рэальнай эканомікай, па сілах пераадолець цяжкасці, прынесеныя звонку,— лічыць беларускі прэм'ер. — Нам гэта ўдасца». Ён таксама звярнуў увагу на тое, што бакі павінны забяспечыць роўны доступ на рынкі адзін аднаго.

Сяргей Сідорскі таксама заявіў пра тое, што бакі дамовіліся не перарываць пастаўкі прадукцыі беларускіх прадпрыемстваў на канвеер Горкаўскага аўтазавода. «Колькасць аўтамабіляў, што выпускае ГАЗ, будзе расці, значыць, будуць запатрабаваныя і беларускія камплектавыя часткі», — падкрэсліў прэм'ер. Акрамя таго, на сустрэчы было абмеркавана пытанне аб стварэнні зборачнай вытворчасці айчынных ліфтаў у Ніжагародскай вобласці.

У сваю чаргу Валерый Шанцаў падкрэсліў, што ў Ніжагародскай вобласці з нашай краінай даўнія сувязі, і ён не бачыць прычын сцвярджаць, што гэты расійскі рынак для Беларусі будзе закрыты. У прыватнасці, Валерый Шанцаў выказаў зацікаўленасць у стварэнні новых сумесных вытворчасцяў як у Ніжагародскай вобласці, так і ў Беларусі. Перспектыўным ён назваў і супрацоўніцтва ў аграпрамысловым комплексе. Акрамя таго, нашы партнёры цікавяцца пастаўкамі гарадскога пасажырскага транспарту, рухомага саставу, дарожнай і камунальнай тэхнікі.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

## РАШЭННЕ КАБЕЛЬНЫХ АПЕРАТАРАЎ АБ ВЫКЛЮЧЭННІ СА СВАІХ ПАКЕТАЎ ПЯЦІ РАСІЙСКІХ ТЭЛЕКАНАЛАЎ НЕ ЎШЧАМЛЯЕ ІНТАРЭСЫ ГЛЕДАЧОЎ,

бо «Першы канал. Сусветная сетка», «РТР-Планета», «НТБ-Мір», «Рен-ТВ», TVCI у пакетах гэтых аператараў дублююцца. Гледачы ўбачаць самыя цікавыя забаўляльныя праграмы, серыялы і фільмы ў сумесных версіях «НТБ-Беларусь», «РТР-Беларусь», «АНТ» і іншых. Такую думку, каментуючы рашэнне Тэлекамунікацыйнага саюза (ТГС), выказаў **намеснік міністра інфармацыі Беларусі Аляксандр СЛАБАДЧУК.** Паводле яго слоў, сітуацыя, якая існавала да сённяшняга дня, не мела аналагаў у сусветнай практыцы, калі на тэрыторыі адной дзяржавы вялася трансляцыя дзвюх версій аднаго і таго ж канала. Да таго ж беларускі глядач бачыў не тую версію, якая транслявалася ў Расіі, а варыянт для замежнага вяшчання, з якога ўжо былі выключаны самыя рэйтынгавыя праграмы. Акрамя таго, на названых тэлеканалах дапускаліся парушэнні беларускага заканадаўства, напрыклад, трапляла на тэлеэкран рэклама тытуню і алкаголю, паслуг эратычнага характару. На думку Аляксандра Слабадчука, аператары кабельнага вяшчання маюць права самі вызначаць склад пакета выходзячы са сваіх эканамічных інтарэсаў і абавязаны забяспечваць выкананне беларускіх законаў.

**БЕЛТА.**

## Хроніка апошніх падзей

### ПАЦЯРПЕЛЫЯ АД КРЫЗІСУ НАПАЛІ НА БАНКІ

Маніфестанты пачалі граміць банкі ў лонданскім Сіці. Ад дзеянняў пратэстантаў першым пацярпеў уваход у офіс Каралеўскага банка Шатланды. Праз павыбіванае шкло, унутр банка патрапілі дымавыя шашкі. Адбыліся сутыкненні з паліцыяй. Паводле інфармацыі тэлеканала SkyNews, сярод паліцыянтаў ёсць параненыя.

Як паведамілі інфармагенцтвы, колькасць удзельнікаў маніфестацыі каля сцен Банка Англіі ў лонданскім Сіці дасягнула прыкладна пяці тысяч чалавек. Гэтая акцыя — «паход на Банк Англіі» — была прымеркаваная да адкрыцця ў брытанскай сталіцы саміту краін «вялікай дваццаткі».

### БЕСПРАЦОЎЕ Ў ЕЎРАЗОНЕ ЗНОЎ ВЫРАСЛА

У сувязі з глабальным эканамічным крызісам, узровень беспрацоўя ў 16 краінах зоны еўра ў лютым дасягнуў самага высокага ўзроўню за апошнія тры гады.

Паводле звестак статыстычнага агенцтва ЕС Eurostat, у лютым 2009-га ўзровень беспрацоўя вырас з 8,3% да 8,5% у параўнанні са студзенем. Гэта азначае, што 13 з паловай мільёнаў чалавек засталіся без працы — на 2 млн больш, чым у лютым мінулага года. У Еўрасаюзе ў цэлым звыш 19 млн чалавек страцілі працоўныя месцы, а гэта значыць — на 3 млн больш беспрацоўных, чым год таму.

### ГАЮЧЫЯ ЎЛАСЦІВАСЦІ ЖАНОЧЫХ ГРУДЗЕЙ

У Германіі даследнікі прышлі да нечаканых высноў пра тое, што разглядванне жаночых грудзей мужчынам не толькі прыемна, але і карысна для здароўя.

Высветлілася, што мужчыны, якія маюць магчымасць рэгулярна бачыць аголеныя жаночыя грудзі, значна менш схільныя рызыцы інфаркту або інсульту, піша DW-World.

Да таго ж, паводле звестак медыцынскага эксперыменту, апублікаваных у часопісе The New England Journal of Medicine, дзесяцігвіліннае разглядванне жаночай красы з лішкам заменіць мужчынскаму арганізму паўгадзіны фізічнай працы або заняткаў спортам. Справа ў тым, што сэксуальная ўзрушанасць актывізуе працу сардэчна-сасудзістай сістэмы і павялічвае прыток крыві і, такім чынам, кісларoду да ўсіх тканак арганізма. З прычыны гэтага, рызыка інфаркту або інсульту памяншаецца на 50%.

### ВЫБУХ ПРЫВЁЎ ДА ТРАГЕДЫІ

Адзін чалавек загінуў на месцы, другі атрымаў апёкі 80 працэнтаў паверхні цела ў выніку выбуху кісларoднага і газавага балонаў увечары 31 сакавіка. Бяда здарылася са слесарамі Баранавіцкай ПМК-10, якія знаходзіліся ў кунгу (спецыяльна абсталяваны для грузавой машыны будцы) аўтамабіля ГАЗ-52. Слесар 1956 года нараджэння загінуў на месцы, а яго 47-гадовы таварыш атрымаў цяжкія траўмы. Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» памочнік начальніка Брэсцкага абласнога ўпраўлення МНС Сяргей Машноў, два чалавекі, якія знаходзіліся ў кабіне аўтамабіля, не пацярпелі. Прычыны надзвычайнага здарэння пакуль высвятляюцца. Расследаваннем займаецца Баранавіцкая пракуратура.

**Святлана ЯСКЕВІЧ, Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## А на мой погляд...

# «ЦЯПЕР САМАЕ ЛЕПШАЕ І РАЗУМНАЕ — УКЛАДВАЦЬ ГРОШЫ Ў НАВУЧАННЕ»

**Якія «ахоўныя механізмы» вы задзейнічалі (або не) у сваім жыцці ў сувязі з фінансавым крызісам: перагледзелі сямейны бюджэт, часова адмовіліся ад нейкіх буйных пакупак, знайшлі падпрацоўку і г.д.?**

**Валерый КАХНОВІЧ, інжынер аддзела па забеспячэнні і збыце дзяржаўнага вытворчага аб'яднання «Белмелія-водгас»:**

— Часова скарацію свае выдаткі. Натуральна, колькі разоў раней садзіўся за стол паесці, столькі ж разоў раблю гэта і цяпер. Іншымі словамі, пры набыцці прадуктаў харчавання я сябе не ўшчамляю *(смяецца)*. А вось ад нейкіх буйных пакупак, сапраўды, часова адмовіўся. Напрыклад, гэта датычыцца спартыўнага рыштунку, карцін, прадметаў быту.

Я лічу, што ў такой сітуацыі самае лепшае і разумнае — укладваць сродкі ў навучанне. Кажу гэта на ўласным прыкладзе, бо пачаў вывучаць шведскую мову, больш паглыблена — англійскую. Першая ў нашай краіне не вельмі распаўсюджаная. Не, нікуды потым з Беларусі я з'язджаць не збіраюся. Але чаму б у будучым не заняцца нейкімі перакладамі са шведскай мовы?! Зноў жа — патэнцыяльная падпрацоўка *(смяецца)!*

**Уладзімір ТАРАСЮК, юрысконсульт унітарнага камунальнага вытворчага прадпрыемства «Камунальнік», г. Горкі:**

— Безумоўна, цэны на прадукты харчавання павялічваюцца, гэтага нельга не заўважыць. Аднак есці хлеб, піць малако штодня не перастанеш, праўда? З іншага боку, у нашай сям'і і раней не было лішніх выдаткаў на харчаванне, таму цяпер неяк моцна эканоміць на гэтым не даводзіцца. Мая жонка, скажам, атрымлівае ад дзяржавы «дзіцячыя» ў памеры 185 тысяч рублёў — на дваіх з дзіцем. Усё астатняе, што я зарабляю, дзеліцца на траіх. Праўда, раней у нас быў валютны крэдыт, дык давялося шукаць дадатковыя магчымасці, каб выплаціць яго, у прыватнасці, пазычаць грошы.

**Яўгенія ЗАРОЎСКАЯ, інвалід II групы, Паўночны пасёлак, г. Мінск:**

— Я размяняла дзявяты дзясятак, жыву з сынам, інвалідам I групы з дзяцінства. Сама нават да крамы дайсці не магу, сын — ляжачы. Старэйшы, які жыве асобна, зараз таксама хварэе... Увесь наш даход — дзве не вельмі вялікія пенсіі. Мяса не ем даўно, калі з'яўляюцца курыныя кумпячкі — па адным кладу ў суп, які раблю на некалькі дзён. А так «націскаем» на бурачкі, капустку, бульбачку. Імі дапамагаюць родныя мужа, таксама пенсіянеры, якія ў Ратамцы маюць участак. Праўда, за камунальныя паслугі плацім толькі 50 працэнтаў. Але калі па той жа электраэнергіі ёсць перарасход — тады 100 працэнтаў. Таму менш мыем бялізну, глядзім тэлевізар, сядзім у прыцемках. На лекі шмат грошай ідзе, нашы не дапамагаюць, даводзіцца купляць імпартныя. За адны лекі заплаціла 45 тысяч, за другія — 11 тысяч. Але за камуналку мы заўсёды разлічваемся ў першую чаргу, ніякай запазычанасці ў нас няма. Раскошы вялікай, як бачыце, няма, але мы не галадаем. Не га-ла-да-ем. Ведаеце, я перажыла вайну, голад, холад, таму, лічу, самае галоўнае — каб быў мір на зямлі. Вельмі люблю глядзець тэлевізар, асабліва навіны, вельмі даўно выпісваю і чытаю сваю любімую «Звязду»... Ведаеце, можа не трэба пра ўсё гэта пісаць?.. Прачытае нехта, яшчэ пасмяецца...

**Таццяна САБАЛЕЎСКАЯ, начальнік аддзела бытавога забеспячэння пенсіянераў і інвалідаў упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Дзяржынскага райвыканкама:**

— Проста выжываем. У нас дастаткова вялікі валютны крэдыт, які мы бралі для набыцця кватэры. Пасля яго выплаты, аплаты камунальных паслуг практычна нічога не застаецца, таму пра нейкія буйныя пакупкі — той жа мэблі ў пустую кватэру, а тым больш пра падарожжы думаць проста не даводзіцца. Жывём ад зарплаты да зарплаты. А тут яшчэ муж трапіў пад скарачэнне. Зараз выбраў сабе працу не па спецыяльнасці, заробак невялікі. Працуе і 20-гадовы сын. Знайсці нейкую падпрацоўку ў нас даволі цяжка, можа ў Мінску з гэтым лягчэй... Але галоўнае — не падаць духам, думаць пра ўласнае здароўе, якое ні за якія грошы не купіш.

**Віктар КАРОГВІЧ, кансультант упраўлення паляўнічай гаспадаркі Міністэрства лясной гаспадаркі:**

— Якія тут рэцэпты? Жывём тым, што маем. Безумоўна, нечага сталі менш купляць. Якія там буйныя пакупкі? Машыны, кватэры, дачы?!. Жонка працуе ў дзіцячым садку, атрымлівае 450 тысяч, ды мой заробак, а ў доме — трое дзяцей. Ці часта езджу на паляванне? Не, рэдка — на адкрыццё ці закрыццё сезона. Хоць цана на разавыя дазволы на здабычу дзічыны і не падаражэла, але ж машыны, бензін... Хіба толькі калі часам зусім стане сумна, дык з сябрамі ездзем у лес, ды і тое не столькі паляваць, а каб пабыць на свежым паветры, пагутарыць.

**Таццяна СКРЫПЧАНКА, старшы навуковы супрацоўнік Мінскага навукова-даследчага інстытута сацыяльна-эканамічных праблем Мінгарвыканкама:**

— Я, напэўна, не лепшы тут прыклад. Справа ў тым, што ў мяне дачка збіраецца замуж, таму ў сувязі з гэтым адбываецца пераразмеркаванне сямейнага бюджэту *(смяецца)*. А ўвогуле, шчыра скажу, крызіс я не адчула. Як працавала раней, як падпрацоўвала — так і цяпер працягваю гэта рабіць. Крызіс — гэта калі няма працы. Так, прадукты харчавання даражэюць, але, з аднаго боку, ад малочнай, рыбнай, мясной групы тавараў цалкам адмовіцца нельга, з іншага — за гады пасля распаду Саюза я прызвычаілася жыць даволі сціпла. Як не магла да крызісу дазволіць сабе білет на канцэрт за 65 тысяч рублёў, так і цяпер не магу. І як хадзіла з сынам і дачкой за значна меншыя грошы ў свой любімы тэатр Купалы, так і цяпер з задавальненнем хаджу *(смяецца)*.

Напэўна, адзінае, што пачала рабіць — гэта ставіцца, прыслухоўвацца больш уважліва да ўласнага здароўя. Я, як кажуць, напярэдадні пенсіі, а папрацаваць бы яшчэ хацелася. Бо калі выйду на пенсію, тады, напэўна, і пачнецца крызіс. А ў якасці нейкіх канкрэтных рэцэптаў... Раней мы неяк больш куплялі сокаў, цяпер жа варым хатнія кісялі, кампоты. Можна з'есці адбіўную, а можна той жа кавалак мяса парэзаць дробна і змяшаць з макаронай, з бульбай, дадаўшы гародніны. І смачна выходзіць, і бялок арганізм атрымлівае...

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

# Выжыве мацнейшы

## Антыкрызісная эканоміка

**15 мільярдаў беларускіх рублёў — такія папярэднія лічбы запазычанасці прадпрыемстваў-перапрацоўшчыкаў мясной і малочнай прамысловасці Гомельскай вобласці сельгасвытворцам на канец сакавіка. Яшчэ паўтара тыдня таму гэтая лічба складала 56 мільярдаў рублёў.**

Адсутнасць абаротных сродкаў у сельгасарганізацыях, выкліканая несвоечасовымі разлікамі перапрацоўчых прадпрыемстваў за здадзеную малочную і мясную прадукцыю, прымусіла гаспадаркі шукаць розныя магчымасці для фінансавання вясенне-палявых работ. Як расказала **начальнік аддзела перапрацоўчай прамысловасці камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гомельскага аблвыканкама Святлана ЗУБКОВА,** размова ідзе ў тым ліку аб выдзяленні аблвыканкамам бюджэтнай пазыкі ў аб'ёме 25 мільярдаў рублёў: каб даць магчымасць прадпрыемствам разлічыцца з вяскоўцамі і тыя нармальна правялі б сяўбу. Цяпер гаспадаркі актыўна крэдытуюцца, для гэтага выкарыстоўваюцца розныя крыніцы фінансавання. Але ж сітуацыя агульная, бо на сёння на сусветным рынку склаліся цэны на мяса-малочную прадукцыю, ніжэйшыя за сабекошт выраблenай і перапрацаванай у Беларусі.

— Мы пры экспарце страчваем грошы. Рэспубліка ў нас невялікая, рынак свой мы ведаем, з'есці мяса-малочнай прадукцыі больш, чым раней, не зможам. Між тым, яна запатрабаваная на знешнім рынку, але на сёння цэны нізкія ва ўсім свеце. Таму прадпрыемствам, якія экспартуюць даволі вялікія аб'ёмы, гэта стала нявыгадна.

— Менавіта таму сёння для нас адна з найважнейшых задач — зніжаць сабекошт малака, у тым ліку пры яго перапрацоўцы, — працягвае тэму **генеральны дырэктар дзяржаўнага аб'яднання «Мясамалпрам» Мікалай ЦЕПЛЯКОЎ.** Гэта магчыма зрабіць за кошт увядзення новых энергазберагальных тэхналогій. Нам абавязкова трэба скарачаць расход цеплаэнергарэсурсаў. Што датычыцца нашых даўгоў вёсцы, пакуль сітуацыя застаецца напружанай, бо на знешніх рынках цана на малако амаль удвая меншая, чым летась. Практычна ўсе прадпрыемствы сёння працуюць са стратамі. Тым не менш, запасаў прадукцыі на складах ужо няма. Жлобінскі і Гомельскі мясакамбінаты атрымалі дазвол «Расветнагляда» на экспарт прадукцыі ў Расію. Ідуць адгрузкі мяса-малочнай прадукцыі ў гэту краіну, але ж прадаём ніжэй за сабекошт. У нас сёння атэставаны пяць прадпрыемстваў для пастаўкі прадукцыі ва Украіну, чатыры з іх экспартуюць туды мяса-малочную прадукцыю. Пастаўляем у асноўным сметанковае масла і прапрацоўваем дамоўленасці па сухім малаку.

Ветэрынары суседняй краіны атрымалі запрашэнне праверыць, як вырабляецца мяса-малочная прадукцыя на 3 мясакамбінатах і 12 малочных заводах. У выніку будзе вызначаны пералік перапрацоўчых прадпрыемстваў, якія атрымаюць права пастаўляць сваю прадукцыю ва ўсе рэгіёны Украіны. Правядзенне такіх інспекцый — агульнапрынятая сусветная практыка па дзяржаўным ветэрынарна-санітарным кантролі і нагляду за якасцю ўвозімых у краіну прадуктаў харчавання. Спецыялісты сыходзяцца ў меркаваннях, што гэты напрамак для айчынных перапрацоўшчыкаў вельмі перспектыўны, адзначае Мікалай Цеплякоў.

— Адначасова мы значна больш пачалі прадаваць мяса-малочнай прадукцыі ў краіны СНД — маю на ўвазе не толькі Расію. Прынамсі, і ў Расійскую Федэрацыю мы прадаём не толькі на Браншчыну, як раней, але і ў Калужскую, Курскую, іншыя вобласці. Прапрацоўваюцца варыянты больш прадукцыі накіроўваць у Казахстан, хоць мы на гэтым рынку прысутнічаем, але пакуль няшмат. Думаем выходзіць і на рынак Таджыкістана, іншых краін Сярэдняй Азіі. Ёсць кірунак работы з Малдовай, нядаўна была сустрэча з прадстаўнікамі Кітая. Яны збіраюцца ўзяць узоры нашай прадукцыі на выпрабоўванне. Такім чынам можа адкрыцца перспектыва рэалізацыі мяса і малака ў Кітай, з якім раней мы не працавалі.

За два месяцы года рост аб'ёмаў натуральнамалочнай прадукцыі склаў 138% да леташняга ўзроўню. Гомельская вобласць нарошчвае і аб'ёмы экспарту натуральнамалочнай прадукцыі, якая раней заўсёды з'яўлялася рэнтабельнай для прадпрыемстваў перапрацоўкі. У многім гэта стала магчымым дзякуючы вялікай рэканструкцыі, якая прайшла на ААТ «Малочныя прадукты» Гомеля. Невыпадкова, відаць, прадукцыя малочных заводаў вобласці ўдастоена Гран-пры, двух залатых і чатырох срэбраных медалёў на VII Міжнароднам форуме «Малочная індустрыя-2009» у Маскве, дзе ўзялі ўдзел больш за 400 кампаній і прадстаўнікоў з больш чым 20 краін.

— Пашыраючы сёння рынкі збыту, — кажа генеральны дырэктар дзяржаўнага аб'яднання «Мясамалпрам» Мікалай Цеплякоў, — мы рыхтуем пакупніка. Любая харчовая прадукцыя будзе купляцца, калі спажывец ацаніў яе якасць і прывык да яе смаку. Таму ў гэтыя складаныя часы, калі цана прадукту не адпавядае затратам, імкнёмся пашыраць сферы сваёй дзейнасці — захапіць рынкі. Выжывае мацнейшы, а мы хочам стаць мацнейшымі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# ПЛАНАВАЦЬ, КАБ МЕЦЬ... ПУЦЁЎКУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Нарэшце, яшчэ адзін шлях. **Сёння Рэспубліканскі цэнтр выступае з прапановай скараціць стандартны тэрмін аздараўлення з 21 да 18 дзён. З аднаго боку, гэта дазволіць знізіць кошт пуцёўкі на 15 %. А з іншага, дзякуючы павелічэнню колькасці заездаў, з'явіцца магчымасць накіраваць у санаторыі дадаткова прыкладна 10 тыс. чалавек у год. Мяркуецца, што гэты варыянт можа «запрацаваць» ужо з III квартала.**

— Прычым сама якасць аздараўлення не пагоршыцца, — падкрэслівае Мікалай Мазур. — Чалавек зможа атрымаць тое ж лячэнне, тую ж колькасць працэдур. Але за больш сціслы тэрмін. У прыватнасці, гэтага можна дасягнуць за кошт паўнавартаснай работы санаторыяў па суботах, а магчыма — і па нядзелях.

### «Варушыцца» за два месяцы

Як адзначаюць у Рэспубліканскім цэнтры, цяпер ажыятажнага попыту на пуцёўкі няма. Не будзе яго і на працягу года ў цэлым. Аднак выключэннем тут можа стаць зноў жа лета, і асабліва — ліпень-жнівень.

— Сітуацыя зразумелая, менавіта на ліпень-жнівень прыпадае асноўная частка водпускаў, — заўважае Мікалай Мазур. — Але трэба разумець і іншае: часы, калі можна было заказаць пуцёўку «сёння на заўтра», ужо прайшлі. Таму калі ёсць жаданне наведаць санаторый, то клапаціцца пра гэта трэба загадзя, што, да слова, добра засвоілі тыя ж расіяне. Практыка паказвае, што зрабіць папярэдняя заяўкі ў здраўніцы лепш за ўсё прыкладна за 60 дзён да плануемай паездкі, а рабіць заяўкі на «пікавыя» месяцы пажадана ўвогуле ў пачатку года. І ў тым ліку такая парада датычыцца тых, хто хоча адпачыць цалкам за свой кошт.

### Стаўка на тых, каму цяжка

**Як і раней, сёлета застаецца магчымасць наведаць здраўніцы з дапамогай дзяржаўных датацый. Іх памер залежыць ад узроўню даходаў за апошнія 12 месяцаў і сезона — «зімовага» (з 1 лістапада да 30 красавіка) або «летняга» (з 1 мая па 31 кастрычніка). Скажам, грамадзянін, штомесячны даход якога не перавышае 0,5 сярэдняй зарплаты па краіне, будзе аплачваць самастойна 15 працэнтаў ад поўнага кошту пуцёўкі ў «зімовы» і 20 працэнтаў — у «летні» перыяд, грамадзянін з даходамі ад 0,5 да 1 сярэдняй зарплаты — адпаведна 20 і 30 працэнтаў, з даходамі ад 1 да 1,5 сярэдняй зарплаты — 30 і 40 працэнтаў, з даходамі ад 1,5 да 2 сярэдніх зарплат — 40 і 55 працэнтаў, з даходамі ад 2 да 3 сярэдніх зарплат — 50 і 70 працэнтаў, з даходамі ад 3 да 4 сярэдніх зарплат — 60 і 80 працэнтаў, ад 4 да 5 сярэдніх зарплат — 85 і 90 працэнтаў, а звыш 5 сярэдніх зарплат — усе 100 працэнтаў незалежна ад сезона.**

Захаваецца і звыклы парадак прадастаўлення «датацыйных» пуцёвак. У прыватнасці, працуючым асобам (і ў тым ліку ветэранам і інвалідам) трэба звяртацца ў камісію па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні па месцы працы. А непрацуючым пенсіянерам, інвалідам, а таксама прадпрымальнікам, якія плацяць узносы дзяржаўнага сацыяльнага страхавання, — да спецыялістаў Рэспубліканскага цэнтра. Такія спецыялісты працуюць у кожным раёне. Пры гэтым у любым выпадку падставай для накіравання ў санаторый стане заключэнне медыкаў аб стане здароўя.

У той жа час сезон-2009 будзе мець свае асаблівасці. Плануецца, што сёлета павялічацца паказчыкі аздараўлення ветэранаў, інвалідаў, студэнтаў і дзяцей у летніках. А вось дзяржзаказ на «датацыйнае» аздараўленне дарослых працуючых грамадзян можа зменшыцца — прынамсі, калі не з'явіцца рашэнне наконт ужо ўзгаданага скарачэння тэрміну наведвання здраўніц.

— Мы перакананыя, што «датацыйныя» пуцёўкі ў першую чаргу павінны атрымліваць менавіта сацыяльна неабароненыя катэгорыі, — заўважае Мікалай Мазур. — А вось працуючыя грамадзяне павінны планаваць адпачынак за ўласныя грошы. І гэта не нейкае вынаходніцтва — падобныя падыходы існуюць паўсюль.

### Цэны сёлета не «скокнуць»

**Тым часам не менш цікавая тэма — цэны. Яны зноў будуць ніжэйшыя, чым у суседніх краінах, дзень наведвання здраўніцы на тэрыторыі Беларусі будзе каштаваць 32-70 тысяч рублёў. Дзень у айчынных санаторыях за межамі нашай краіны абыдзецца даражэй — 80-120 тысяч.**

— З улікам рэальнай сітуацыі санаторыі не пайшлі на значнае павелічэнне цэнаў, а некаторыя здраўніцы нават знізілі кошт сваіх паслуг, — адзначае Мікалай Мазур. — Прычым «рэзкіх рухаў» тут не адбудзецца і надалей. **Максімум, на што могуць пайсці здраўніцы сёлета, гэта павышэнне цаны пуцёўкі не больш чым на 0,5 % у месяц.**

### Прафсаюзы захаваюць зніжкі

**Члены прафсаюзаў, якія наведваюць прафсаюзныя санаторыі за свой кошт, сёлета зноў будуць мець права на 15-працэнтную зніжку з кошту пуцёўкі.** Пра гэта карэспандэнту «Звязды» паведаміў **генеральны дырэктар УП «Белпрафсаюзкурорт» Анатоль ВАСЮКЕВІЧ.**

Для атрымання зніжкі неабходна афарміць даведку аб членстве ў прафсаюзе. Такую даведку выдае прафкам арганізацыі. Сама даведка можа быць адвольнай формы, абавязкова толькі, каб на ёй былі пячатка прафкама і подпіс яго старшыні.

Падаць даведку неабходна па месцы набыцця пуцёўкі — у «Белпрафсаюзкурорт» або непасрэдна ў санаторый. Дарэчы, адзначыў Анатоль Васюкевіч, **кошт дня адпачынку ў прафсаюзных здраўніцах, у залежнасці ад узроўню камфортнасці, сёлета вагаецца ў межах 32-100 тысяч рублёў. Пры гэтым чакаецца, што сваім правам на зніжкі скарыстаецца каля 80 тысяч грамадзян Беларусі.**

**Сяргей ГРЫБ.**

# АДПАЧЫЦЬ АД КРЫЗІСУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У першы дзень кірмашу адбылася прэзентацыя шасці новых маршрутаў экскурсій і тураў па Беларусі, прысвечаных 65-й Гадавіне вызвалення нашай зямлі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Году роднай зямлі.

У тэматычнай ваенна-гістарычнай экскурсіі «Барысаўскія старонкі Халакоста», якую распрацавала турфірма «Чатыры сезоны плюс» (Барысаў), перапляліся краязнаўчыя, гістарычныя і настальгічныя матывы, падзеі мінулай вайны, лёсы барысаўчан, якія перажылі трагедыю Халакоста.

Горад Барысаў уваходзіць і ў тур «Сем цудаў Міншчыны», які прадставіла турыстычнае прадпрыемства «Солвекс» (Мінск). Гэта 2-дзённая вандроўка (Мінск — Барысаў — Будслаў — Вілейка — Івянец — Нясвіж) знаёміць з сямю самымі значнымі архітэктурнымі помнікамі Міншчыны, якія былі выбраны летась праз інтэрнэт-галасаванне.

Знаёмства з яшчэ адным цудам Беларусі, на гэты раз не архітэктурным, а сакральным і экалагічным, абяцаюць арганізатары экскурсіі «Легенды Блакітнай святыні» турыстычнае прадпрыемства «Магілёўаблтурыст» (Магілёў). «Звязда» пісала і пра знакамітую «Блакітную крыніцу» пад Слаўгарадам і змяшчала фотарэпартаж пра традыцыю купання ў возер. Цяпер ёсць магчымасць патрапіць у гэтае дзіўнае месца з дапамогай турыстычнага маршруту, які пачынаецца ў Магілёве, праходзіць праз легендарную вёску Лясная, і заканчваецца ля Блакітнай крыніцы — адным з самых маляўнічых куткоў нашай зямлі.

Экскурсаводы Мінска — Наталля МАРОЗАВА і Ірына КАВАЛЬ, распрацавалі цалкам новую экскурсію «Смілавіцкая мазаіка», прысвечаную мясцінам, з якімі звязаны імёны Агінскіх, Манюшкі, Ваньковічаў і сусветна вядомага мастака Хаіма Суціна, які заснаваў парыжскую школу жывапісу і карціны якога на сусветных аўкцыёнах ацэньваюцца ў мільёны долараў.

Упраўленне фізічнай культуры, спорту і турызму Гродзенскага аблвыканкама прадэманстравала навінкі, якія чакаюць удзельнікаў маршруту «Аўгустоўскі канал».

І нарэшце, вельмі актуальная на пачатку красавіка эксклюзіўная прапанова — пасхальны тур «Велікодныя традыцыі Пастаўшчыны». Нічога падобнага яшчэ не было: толькі ў перыяд святкавання каталіцкага і праваслаўнага Вялікадня ёсць магчымасць не толькі на свае вочы ўбачыць унікальны двух'русны алтар у Дуніловіцкім касцёле, пакланіцца цудатворнаму абразу Маці Божай Ларэтанскай, наведаць Свята-Успенскую царкву ў Маньковічах і адзіны ў нашай краіне музей гісторыі каталіцкага касцёла ў Паставах, але і набыць на велікодны стол фарбаваныя яйкі... страуса.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ ВЫЗНАЧЫЛА ЛЕПШЫЯ АГЕНЦТВЫ НЕРУХОМАСЦІ

**За апошнія чатыры гады ў Беларусі было выдадзена 189 ліцэнзій на аказанне рыэлтарскіх паслуг, паведаміла начальнік упраўлення адвакатуры і ліцэнзавання юрыдычнай дзейнасці Міністэрства юстыцыі Галіна ГРЫШКАВЕЦ.**

Сёлета дзейнічаюць 107 рыэлтарскіх арганізацый, у якіх працуюць 640 атэставаных рыэлтараў. Летась пачала дзейнічаць «празрыстая» сістэма аплаты рыэлтарскіх паслуг. Менавіта пасля гэтага ў агенцтвах істотна павялічылася выручка. Так, летась у Беларусі па лініі агенцтваў нерухомасці было 29 тысяч здзелак, а выручка — большая за 27 млрд рублёў, што на 10 млрд рублёў больш, чым у 2007 годзе.

Эксперты Міністэрства юстыцыі вызначылі лепшыя рыэлтарскія арганізацыі: агенцтва нерухомасці г. Брэста ЗАТ «Альфа-Актыў», дзяржаўнае прадпрыемства «Віцебскае агенцтва па аказанні рыэлтарскіх паслуг», ААТ «Дзінас» (г. Мінск), ААТ «Твая сталіцакансалт» (г. Мінск).

Асобна спецыялістамі Мінюста была адзначана дзейнасць па комплексным аказанні паслуг у сферы нерухомасці і прававым інфармаванні насельніцтва ў сродках масавай інфармацыі агенцтваў нерухомасці «Загарадны дом» і «Твая сталіца».

**Кіраўнік дзяржаўнага прадпрыемства «Віцебскае агенцтва па аказанні рыэлтарскіх паслуг» Уладзімір КАБАНАЎ** адзначыў, што выручка іх рэгіянальнага агенцтва летась склала 455 мільёнаў рублёў, або павялічылася за год на 55 працэнтаў. Разам з тым, кіраўнік агенцтва адзначыў, што па выніках іх дзейнасці за першыя месяцы года колькасць здзелак куплі-продажу кватэр паменшылася амаль у 2,5 раза. Зараз у Віцебску назіраецца далейшае патанненне ўсіх відаў кватэр. Сёння аднапакаёвыя кватэры ў дзевяціпавярховых дамах каштуюць ужо не больш за 25—27 тысяч долараў, а аднапакаёвыя «хрушчоўкі» ў пяціпавярховых дамах прапануюцца не даражэйшыя за 23—25 тысяч долараў. Амаль адсутнічае попыт на другасным рынку Віцебска на шматпакаёвыя кватэры. Цяпер прадаць трохпакаёвую кватэру даражэй чым за 50 тысяч долараў ужо немагчыма, лічыць Уладзімір Кабанаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Абзац

■ Беларусь і Сусветны банк узгаднілі праект пагашэння аб пазыцы ў памеры $125 млн, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў РУП «Белінвестэнергазбяражэнне».

■ **За арганізацыю канала нелегальнай міграцыі ў Мінску затрыманы двое грамадзян Шры-Ланкі. Яны — навучэнцы каледжа, у кастрычніку мінулага года арганізавалі незаконны ўезд і знаходжанне на тэрыторыі Беларусі сваіх суайчыннікаў. Узбуджана крымінальная справа.**

■ Стаўка экспартнай пошліны на нафту ў Беларусі з 1 красавіка зніжана да $110 за 1 тону. Адпаведнае рашэнне змяшчаецца ў пастанове Урада № 382, паведамілі БЕЛТА ў Апараце Саўміна.

■ **У Мінску на вадасховішчы Дразды ўзнікла пагроза жыццю рыбакоў, якія апынуліся на ільдзіне, што адкалолася на адлегласці 5 км ад берага. Усе чацвёра выратаваны супрацоўнікамі МНС з дапамогай спецсродкаў. Пасля гэтага выратавальнікі вырашылі абследаваць акваторыю вадаёма і выявілі яшчэ адну групу рыбакоў (таксама чацвёра) на ільдзіне на адлегласці 150 м. Усе выратаваны, пацярпелых няма.**

■ Светлагорскі махляр прадаваў сваім кліентам звычайны парашок пад выглядам гераіну. Падчас правядзення супрацоўнікі міліцыі праверачнай закупкі ён пад выглядам гераіну збыў за Br270 тыс. 1,02 г парашкападобнага рэчыва, якое не ўтрымлівала наркатычных сродкаў. 24-гадовы малады чалавек і раней прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за незаконны абарот наркатычных сродкаў і махлярства. Узбуджана крымінальная справа.

■ **У С.-Пецярбургу на плошчы перад Фінскім вакзалам невядомыя ўзарвалі помнік У. Леніну. Пасля выбуху ў паставе Ільіча ўтварылася дзірка дыяметрам каля метра, вакол пабіта 8 ліхтароў з 10. Ахвяраў няма. Помнік Леніну перад Фінскім вакзалам усталяваны на месцы, дзе правадыр сусветнага пралетарыяту прамовіў славуты

# РАМАНТУЕМСЯ Ў КРЫЗІС

**Вы ўладальнік старой добрай хрушчоўкі, якая зроду не бачыла нармальнага рамонту. Але яе таксама можна зрабіць утульнай. Зразумела, укладаць вялікія грошы ў жыллё, у якім вы не збіраецеся жыць вечна, няма ніякага жадання. Але нават рамонт эканамкласа ператворыць яе ў большменш прыстойнае жыллё. І ёсць сэнс заняцца ім прама цяпер.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У сувязі з крызісам попыт на апрацоўчыя работы скараціўся. Хтосьці чакае далейшага зніжэння цэнаў на жыллё і паслугі, хтосьці не хоча пазбаўляцца долараў. На рынку вельмі шмат будаўнікоў, якім не хапае працы: па-першае, замарожванне расійскіх будоўляў прывяло да таго, што шмат беларусаў, якія здабывалі хлеб за межамі краіны, вярнуліся на радзіму. Па-другое, у Беларусі менш будуецца камерцыйнага жылля, а гатоваe больш часу чакае будучых уладальнікаў, і адпаведна апрацоўшчыкаў (патэнцыяльныя пакупнікі чакаюць зніжэння цэнаў на квадратны метр, а прадаўцы не хочуць аддаваць свой тавар танна). У прыватнай будаўнічай галіне ўсе адзін аднаму павінныя, забудоўшчыкі не аплачваюць запазычанасці як асобным фірмам, якія ім дапамагалі пры будоўлі, так і рабочым.

Але ўся гэта неразбярыха ў будаўнічай галіне на руку звычайнаму абывателю, якому неабходна рабіць рамонт. Каб знайсці хоць якую працу, фірмы і прыватнікі вымушаныя зніжаць цэны на апрацоўчыя работы. Расцэнкі на рамонтныя паслугі знізіліся на 20-50 працэнтаў у параўнанні з леташнімі. Акрамя таго, прыводзіць кватэру ў парадак цяпер больш выгадна і таму, што летам, як правіла, назіраецца некаторае павышэнне цэнаў на асобныя будматэрыялы і паслугі. У сезон, калі попыт на працоўныя рукі вырастае, тэрміны рамонту ў вашай кватэры будуць зацягвацца проста таму, напрыклад, што плітачнік заняты на іншым аб'екце. Нягледзячы на тое, што многія структуры, якія займаліся будаўніча-апрацоўчымі работамі, вымушаны зніжаць цэны, элітныя спецыялісты, якія заўсёды запатрабаваныя, працягваюць працаваць па старых расцэнках. У выніку разбежкі ў цэнах на рамонтныя паслугі могуць быць даволі значнымі. Напрыклад, **пакласці плітку сёння можна як за 4 долары за квадратны метр, так і за 13**.

Так, і за нізкую цану можна зрабіць нядрэнны рамонт. Зразумела, калі пашанцуе і вам патрапіцца сумленны выканаўца. Сёння на рынку апрацоўчых работ шмат людзей, якія не маюць спецыяльнай адукацыі. Хоць і чалавек без спецыяльнасці можа патрапіцца з залатымі рукамі, у той жа час як асоба з дыпломам зробіць немаведама што. Наогул выбраць спецыялістаў, якія будуць чараваць над вашай кватэрай, гэта як сыграць у латарэю: незалежна ад кошту — невядома, што вам патрапіцца.

## Шукаем выканаўцаў

Самы надзейны спосаб — зразумела, наймаць работнікаў па рэкамендацыі знаёмых. Таксама ёсць сэнс дамовіцца з асобамі, якія цяпер праводзяць апрацоўчыя работы на пэўных аб'ектах (напрыклад, на вашым жа прадпрыемстве), вы адразу можаце паглядзець, на што яны здольныя.

«Скупы плаціць двойчы», — заўважае **галоўны інжынер будаўнічай кампаніі «Atelit» Анатоль СКУРАТОВІЧ**. — Можна рабіць самыя розныя памылкі: выбраць дрэнных рабочых, эканоміць на матэрыялах ці на тэхнічным працэсе, няправільна прадумаць дызайн, пашкадаваць грошы на асобныя работы. Так, калі няма якаснай падрыхтоўкі, пабелка на крывой столі не будзе глядзецца. Калі будаўнікі не прытрымліваюцца ўсіх тэхналогій, шпалеры могуць адставаць цэлымі палосамі, пліткі адвальвацца. Ды і калі работа выканана нядбайна, усё адчуванне ад рамонту губляецца.

Сярод плюсаў пры выбары фірмаў тое, што яны гатовы ўзваліць на сябе абсалютна ўсе клопаты, і гаспадару кватэры не давядзецца бегаць па кірмашы і шукаць сілікон ці вадкія цвікі. Сур'ёзныя фірмы маюць магчымасць накіроўваць сваіх работнікаў на курсы павышаць кваліфікацыю. Кампаніі даюць гарантыі на выкананыя работы. Прынамсі, цана ў фірмах не бярэцца з галавы, ёсць методыка вызначэння кошту будаўнічых паслуг, распрацаваная Рэспубліканскім навукова-тэхнічным цэнтрам у будаўніцтве. У ідэале ў розных арганізацый павінны быць аднолькавыя цэны, але тыпы работ настолькі розняцца, і кватэры патрабуюць асобнага падыходу, што нават у адным і тым жа пакоі прадстаўнікі розных фірмаў могуць налічыць розныя сумы, адны прыменяць пэўныя каэфіцыенты, а іншыя — не. Калі вы аддаяце перавагу фірме, пацікаўцеся, колькі часу яна існуе, ці зарэгістравана, якая форма ўласнасці, ці ёсць ліцэнзіі на пэўныя віды работ (калі вы збіраецеся ў сваёй кватэры рабіць перапланіроўку, без ліцэнзій не абысціся). Праўда, паслугі фірмы на 20-30 працэнтаў даражэйшыя, чым у прыватнікаў. І будзьце гатовыя, калі вы плануеце танны касметычны рамонт, што вялікія фірмы адмовяць вам: навошта вазіцца з хрушчоўкай, калі можна зарабіць на элітным жыллі?

Калі вы не плануеце вялікіх змен і паслугі фірмаў вам не па кішэні, больш танны варыянт — знайсці невялікую брыгаду. Прапановы ўзяцца за рамонт у вашай кватэры можна знайсці ў абвестках, што вісяць на слупах, у спецыяльных газетах і часопісах, у інтэрнэце. Але невядома, хто стаіць за голым тэкстам абвестак.

**Пакідаю ў інтэрнэце заяўку на сайце «StroiGid.com»**, дзе апісваю, якія работы трэба правесці ў маёй кватэры, паведамляю, што распачаць іх можна прама зараз, і памячаю, што разлічваю на рамонт эканамкласа. У гэты ж дзень мне падбіраюць некалькі падрадчыкаў. На сайце я магу паглядзець здымкі з іх папярэднімі работамі і пачытаць водгукі папярэдніх кліентаў. Прываблівае і абяцанне, што будаўнікі, якія прадстаўлены ў базе сайта, маюць добрыя рэкамендацыі, тыя з іх, якія не справяцца з работай, не змогуць надалей карыстацца гэтым сэрвісам. Служба зручная тым, што я без усялякіх намаганняў адразу ж атрымліваю тэлефоны некалькіх падрадчыкаў, падабраных менавіта пад мае запыты. Далей ужо ўсё будзе залежыць ад маёй інтуіцыі, ці здолею я выбрацца патрэбнага чалавека, які зробіць усё якасна і пры гэтым не абдзярэ мяне, як ліпку.

Абавязкова непасрэдна дома правядзіце тэндар. Праслухаўшы прапановы некалькіх патэнцыяльных падрадчыкаў, вы зможаце зрабіць пэўнае ўяўленне пра тое, з кім з іх лепш мець справу. Пацікаўцеся, што за людзі будуць працаваць над вашай кватэрай: у сезон фірмы могуць наймаць асобных работнікаў. Складзіце дагавор, прапішыце каштарыс, пажадана, каб былі прадуманы тэрміны выканання асобных работ, гэта засцеражэ вас і ад зацягвання часу рамонту, і ад аўральных паскарэнняў, што можа адбіцца на якасці работ. Прадумайце як будзеце расплачвацца. Лепшы варыянт, калі вы будзеце паэтапна аплачваць выкананыя работы, каб, па-першае, не патрапіць на псеўда-рамонтнікаў (нярэдкая з'ява, калі падрадчык знікае разам з авансам), па-другое, калі раптам, вас нешта не задаволіць у рабоце пэўнай брыгады, вы можаце адмовіць ёй падчас работы. Ёсць сэнс патаргавацца, але не перастарайцеся: значна вялікія зніжкі могуць адбіцца на якасці (ці асобныя работы не будуць зроблены, ці матэрыял выкарыстаны больш танны).

Асобна абмяркуйце, хто будзе набываць матэрыялы. Лепшы варыянт — рабіць гэта разам з работнікамі. Калі кампанія выкарыстоўвае не свой матэрыял, яна якасці не гарантуе. За кожны лішні крок рабочых трэба плаціць (транспартныя выдаткі, пагрузка — разгрузка, падыманне матэрыялаў на ваш паверх і г.д). Калі ў вас няма часу і вы не разбіраецеся ў будматэрыялах, ёсць сэнс даверыцца прафесіяналам, часам, гэта абыходзіцца не намнога даражэй, бо рабочыя ведаюць, дзе набыць яго танней, дзе выбіць зніжкі. Матэрыялы з дастаўкай дамоў можна заказаць і па інтэрнэце. На кошт матэрыялаў таксама ўплывае крызіс: на адны з іх цэны зніжаюцца, а на іншыя, наадварот, бо расце курс долара. Так, **падлога ламінаваная сёння можа каштаваць 30-70 тысяч за квадратны метр, паркет — у два з паловай разы больш, лінолеум — 15— 45 тысяч за метр квадратны, плітка керамічная для падлогі ад 20 тысяч за квадратны метр; шпалеры ад 4 тысяч беларускіх рублёў за рулон да некалькіх дзясяткаў долараў (усё залежыць ад матэрыялу і краіны вытворчасці); грунтоўка — каля 60 тысяч за 10 літраў, сумесь для наклейвання плітак за мяшок у 25 кілаграм — 14—16 тысяч, акрылавая эмульсія для сцен і столі за вядро на 10 літраў — каля 50 тысяч, шпатлёўка за 15 кілаграм — 20 тысяч, гіпсакардон ад 4 тысяч за квадратны метр.**

## Танны варыянт

Ёсць яшчэ такі варыянт — звярнуцца па дапамогу ў правядзенні рамонту ў ЖЭС, ці рамонтныя брыгады, якія цяпер дзейнічаюць пры многіх ЖРЭА. «Сёння жыллёвымі службамі выконваецца шырокі спектр платных паслуг, ад звычайных, накшталт элементарнай замены пракладкі, змяшальніка, да еўрарамонту ў кватэрах. Белбудпраектам распрацаваны расцэнкі на такія паслугі, іх каля 940. Цэны тут самыя нізкія (удвая менш за рыначныя). Усё дзеля таго, каб зацікавіць насельніцтва і яно звярталася па дапамогу ў рамонце менавіта ў жыллёвыя службы», — заўважае **кіраўнік вытворчага аддзела Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі Генадзь МІСУНА**. Людзі часта наракаюць, што ад супрацоўнікаў гэтых службаў не атрымаеш якаснай работы, падстава таму ёсць — больш высокія заробкі на прыватным рамонтным рынку ўплываюць на тое, што выдатныя спецыялісты пакідаюць ЖЭСы. Але нарвацца на халтуршчыкаў можна і на прыватным рынку. Ва ўсялякім разе, калі раптам, пасля рамонту ў заказчыкаў нешта здарыцца, напрыклад, прарве трубу, гаспадару кватэры не давядзецца плаціць грошы за наступствы. І ліквідацыю непаладкі, і рамонт у затопленых суседзяў жыллёвая служба возьме на сябе, а прыватніка, ды такога, з якім не быў падпісаны дагавор, паспрабуй яшчэ адшукай. Калі вы заказваеце паслугі ў ЖЭСе, атрымліваеце гарантыі і магчымасць уплываць на работнікаў. Але і ў жыллёвых службах умеюць задавольваць кліентаў, сведчанне таму — сюды па дапамогу звяртаюцца не толькі простыя жыхары, але і людзі забяспечаныя. І як заўважае Генадзь Місуна, гэта галіна знаходзіцца на стадыі рэфармавання, напрыклад, зараз разглядаецца ідэя, каб грошы, якія паступаюць дзякуючы аказанню платных паслуг, ішлі на развіццё (закупляліся больш дарагія матэрыялы і абсталяванне, работнікі атрымлівалі прэміі, якія будуць іх стымуляваць). Прынамсі, вы не абавязаны заказваць работніка менавіта ў сваёй жыллёвай службе: пачулі, што ёсць добры электрык у суседнім ЖЭСе — звяртайцеся туды. Сярод мінусаў пры выбары супрацоўнікаў жыллёвых службаў — тое, што яны не заўсёды могуць прыйсці ў дакладны час. Калі ў раёне аварыйная сітуацыя, зразумела, яны будуць займацца ёю, а не платнымі паслугамі. Так было ў маіх знаёмых, якія днямі рабілі рамонт у ванным пакоі і вырашылі заказаць у сваім ЖЭСе сантэхніка, каб памяняць трубы. Ім давялося чакаць яго некалькі тыдняў, пры гэтым людзям даводзілася кожны раз адпрошвацца з працы.

Але асобныя віды паслуг, калі іх выканаўцы нідзе не задзейнічаны, можна атрымаць ужо ў дзень звароту. У жыллёвай службе заўсёды можна заказаць нейкія дробныя работы, паспрабуй яшчэ знайдзі прыватніка, які пагадзіцца ехаць да вас, каб проста ўрэзаць у дзверы замкі ці вочка, усталяваць патрон ці выключальнік. Калі вы робіце рамонт самастойна, у ЖЭС зручна звяртацца па дапамогу ў тых работах, якія патрабуюць адпаведных ведаў: напрыклад, калі справа зайшла да электратэхнічных паслуг і замены сантэхнікі. Так, **замена ўнітаза вам абыдзецца ў 22 912 рублёў, ванны — 57 566, умывальніка — 22 879, змяшальнікаў — 14 878, змеевіка — 15 793, усталяванне прыбораў уліку вады — 37 780, люстры — 17 994 рублёў. Калі вы вырашыце праводзіць рамонт з дапамогай жыллёвай службы, разлічвайце на такія сумы: водаэмульсійнае ці акрылавае фарбаванне столі каштуе — 4415 рублёў за квадратны метр,**

**паклейка шпалер ціснёных і тоўстых — 2934, вільгацеўстойлівых — 5239 за метр квадратны;**

**абліцоўка сцен керамічнай пліткай — 17 912, полістэрольнай на масціцы — 9951;**

**акрылавае фарбаванне столі — 4415, сцен — 3604;**

**укладка ламінаваных падлог — 4190, перасцілка падлогі з дошак (зняцце плінтусаў, ачыстка дошак, насціл старых і дабаўленне новых) — 7863;**

**замена дзвярнога блока — 29 329, усталяванне замкоў — 4190, усталяванне падваконнай дошкі — 2702 за метр квадратны, а здыманне старой — 1780, змена аконнага блока пры памерах больш за 2 метры квадратныя — 35 505, менш — да 29 002).**

**Так, поўны рамонт у хрушчоўскім санвузле (з дэмантажам старой пліткі і ўкладкай новай, абсталяваннем столі, заменай труб і ўстаноўкай сантэхнікі), без уліку будматэрыялаў, можа абысціся каля 1 мільёна рублёў, калі вас абслужыць ЖЭС, і ў суму ў 800—1000 долараў, калі вы заказваеце прыватніка.**

**Прыкладныя ж расцэнкі на прыватным рынку цяпер такія: проста паклейка шпалераў — ад 1—2 долараў за метр квадратны; з падрыхтоўкай — ад 5 (трэба ўлічваць, што кошт паклейкі залежыць ад тыпу шпалераў), чыстая кладка плітэк $4—13 за квадратны метр, (падрыхтоўка, якая ўключае здыманне старога пакрыцця, выраўноўванне сцен, яшчэ каля $4 за кожны метр), шпаклёўка і фарбаванне столі — 6, укладка ламінату — 4, усталяванне дзвярэй — ад 20 да 40 долараў.**

## Вызначаемся з фронтам работ

Сёння ў рэспубліцы жылля, пабудаванага паўстагоддзя таму, каля 25 мільёнаў квадратных метраў. Пасля капітальных рамонтаў, падлічана, гэтыя будынкі здольныя праслужыць яшчэ каля стагоддзя. Маладыя сем'і ўспрымаюць хрушчоўкі як больш менш даступнае жыллё, дзе можна прытуліцца да лепшых часоў. У асобных кватэрах жыльцы мяняюцца амаль што не кожныя чатыры гады. Зразумела, у такім разе няма сэнсу бракаваць за выраўноўванне сцен. Але калі вы плануеце ў хрушчоўцы жыць доўга, напэўна, ператварыць яе ў прывабнае не пашкодзіла б.

Толькі перш пацікаўцеся ці не плануецца ў вашым доме правядзенне капрамонту. І калі так, якія работы там будуць праводзіцца. Напрыклад, калі там будуць мяняцца стаякі, трубы, няма сэнсу распачынаць дарагі рамонт у санвузле.

Такія віды работ, як перапланіроўка, перанос сантэхнічнага абсталявання ў іншае месца, перанос разетак павінны рабіцца па спецыяльным праекце і з дазволу адпаведных структур. Па растлумачэнні можна звярнуцца ў жыллёвую службу. Нават замена акон павінна ўзгадняцца, бо ваша рама не павінна выбівацца па архітэктурным рашэнні, колеры з фасада будынка.

Перад пачаткам рамонту не пашкодзіла б заручыцца і згодай суседзяў, асабліва калі вы плануеце праводзіць шумныя работы.

А ўжо далей вызначайцеся з планам работ у залежнасці ад таго, наколькі вы гатовыя да гэтага фінансава.

Ёсць пэўныя прыёмы, якія дазволяць зрокава павялічыць маленькія пакоі. Замена старых вокнаў не толькі прыбавіць цяпла, але і створыць дакладныя геаметрычныя прапорцыі і формы. Як правіла, столі ў хрушчоўках крывыя і іх выраўноўванне дадае кватэры прасторы. Падвясная столь можа таксама даць эфект пашырэння пакоя. Ёсць сэнс пазбавіцца ад старога патраланага лінолеуму, ці што яшчэ горш, дошак, якія ў хрушчоўках з іх добрай чутнасцю падаюць суседзям сігналы аб вашым перамяшчэнні. Сёння вельмі папулярны ламінат, ён недарагі і мае фактуру і колеры натуральнага дрэва і камення. Асноўнае правіла ў выбары шпалераў — чым меншы пакой, тым больш светлымі яны павінны быць, каб пашырыць прастору. Сем'і, якія засяляюцца ў хрушчоўкі і ведаюць, што там давядзецца затрымацца надоўга, як правіла, робяць рамонт у санвузле, мяняюць падлогу і рабочую паверхню на кухні. Сярод перапланіровак — будаўніцтва калідора за кошт вялікага пакоя і сумяшчэнне кухні з залай.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Карысная парада

# ДОБРАМУ ГАСПАДАРУ — надзейных стальных памочнікаў

## Якія сякеру або калун можна набыць у крамах ці на будрынках?

**Сякера (ці хоць бы сякерка) ёсць практычна ў кожнай гаспадарцы, у тым ліку і гарадской: універсальная, цяслярская або на крайні выпадак турыстычная. Калун жа больш характэрны для прыватных падворкаў, дзе ёсць неабходнасць рэгулярна ў вялікай колькасці нарыхтоўваць дровы. Форма ляза, вага інструмента, тып тапарышча і яго даўжыня, спосаб вырабу сякеры ці калуна кожны мужчына выбірае на свой капыл. Рыштунак гэты хоць і адносна просты па сваёй сутнасці, аднак без яго часам у гаспадарцы — ну ніяк. Што сёння прапануюць сталічныя крамы і будаўнічыя рынкі?**

### КРЫХУ АСАБІСТАГА

Сячы дровы я люблю з маленства. Настолькі ранняга, што нават не памятаю дакладна: адкуль і як тое павялося. Захаваўся фотаздымак, дзе я, малеча, як падаецца, гадоў каля пяці, пазірую побач з бацькам (у мужчын на талацэ быў перакур): задаволены, над калодкай трымаю... кухонную сякерку. «Дарослы» інструмент я б проста не змог утрымаць. Калі падрос, прасіў-патрабаваў у бацькі «ўласныя» калодку і невялікую сапраўдную сякерку — сек побач з ім нейкія трэскі. Ён у хату па патрэбе, а я за цурку... Некалькі разоў у адсутнасць бацькі сек сабе пальцы. Памятаю, што, ідучы ў хату з акрываўленымі рукамі, не плакаў, а толькі моцна баяўся, што бацька адбярэ сякерку. Ён перабінтоўваў мае пальцы і сапраўды пагражаў гэта зрабіць. І вось тут я пачынаў енчыць, прасіў, каб не рабіў...

Апошнім разам мы з братам папілавалі бензапілой «КамАЗ» дроў, пасеклі і паскладалі дровы за тыдзень. Прычым, працавалі без аніякага напружання, хутчэй — у задавальненне. Але справа была ў жніўні, абодва былі ў водпусках. Сёлета такую ж машыну-лесавоз 5,5-метровых бярвенняў прывезлі ў сярэдзіне сакавіка, значыць (з улікам працы ў рэдакцыі), часу да пачатку сезона агародніцтва не так і шмат. Спахапіўся — а тапарышчы ў сякер патрабуюць замены, а лепш увогуле набыць новую сякеру ці калун.

### ВЫБІРАЕМ СЯКЕРУ? ЦІ КАЛУН?

У адрозненне ад брата, мне ямчэй працаваць сякерай. Зразумела, мы гаворым пра інструмент, прызначаны менавіта для таго, каб сячы дровы, бо ў таго ж цяслярскага зусім іншае прызначэнне. Зразумела, калі цуркі тоўстыя або драўніна паспела высахнуць (яшчэ горш, калі цурка крывая і на ёй шмат сукоў), даволі часта лязо можа захрасаць у драўніне. Тады, каб вызваліць сякеру, даводзіцца або «кідаць» «насаджаную» на яго цурку на абух праз плячо або біць па тым жа абуху кувалдай. Значыць, у гэтым выпадку інструмент, выраблены шляхам ліцця, адназначна не падыдзе: хутка расколецца. Такую нагрузку можа без праблем вытрымаць толькі каваная сякера. Гавораць, самыя лепшыя такія сякеры — самаробныя, але ў краме, вядома, іх не купіш. Увогуле, прапанова была не такой вялікай, як я напачатку разлічваў. Пра асартымент і цэны пагаворым крыху пазней, а пакуль вернемся да нашай сякеры.

Яна не павінна быць занадта лёгкай. Кажуць, каб эфектыўна працаваць, агульная вага інструмента не павінна быць меншай за 900 грамаў. Другая не менш важная характарыстыка — даўжыня тапарышча. Мінімальная павінна быць такой, каб зручна было дзейнічаць абедзвюма рукамі. Для лёгкай сякеры гэта мінімум 50 сантыметраў, для больш цяжкай — не менш за 70 сантыметраў. Хаця асабіста ніякіх парадаў даваць тут не буду — усё можа быць індывідуальна.

Калун — тая ж сякера, толькі лязо яго мае форму кліна з вуглом прыкладна 30 градусаў. Гэта дазваляе рассякаць нават самыя тоўстыя цуркі, прычым пры меншай сіле ўдару. Зразумела, як і ў выпадку з сякерай, даўжэйшае тапарышча дазваляе зрабіць больш магутны па сіле размах. Вага калуноў (адпаведна, як і форма) можа быць рознай. Напрыклад, на рынку я бачыў максімальна цяжкі інструмент — 3,6 кілаграма, на доўгім, больш чым метровым, тапарышчы. Такім можна «ўзяць», напэўна, практычна любую цурку. Іншае пытанне: ці доўга зможаш махаць такім «монстрам»?.. Калун таксама можа захрасаць у драўніне, значыць, часам без кувалды не абысціся. Што гэта азначае? Ён таксама павінен быць каваным, а не літым.

### ДРЭВА ЦІ ПЛАСТЫК?

На што трэба абавязкова звярнуць увагу, дык гэта на якасць тапарышча. Ідэальны варыянт — зробленае самастойна з бярозы. Калі няма часу ці магчымасці самому выразаць яго, давядзецца ісці ў краму (на рынках іх не прадаюць). Не скажу, што выбар мяне парадаваў, але патрэбнае ў выніку я знайшоў. Хоць тыя тапарышчы яшчэ давядзецца самастойна зашкурваць, каб падчас працы не «зняць» скуру з рук. Натуральна, на добрым тапарышчы не павінна быць ніякіх шчылін і сучкоў. Для працы зручна, каб ручка мела выгін і ўшчыльненне на канцы — пад рукой. Трэба памятаць і пра тое, што чым большая плошча датыкання тапарышча і сякеры, тым больш даўгавечным будзе першае. Калі сякера ў адтуліне вузкая, некаторыя ў гэтым выпадку ўзмацняюць тапарышча знізу чымсьці металічным: выразанай стужкай з металу ці вялікім цвіком, які потым прыкручваецца да тапарышча тканінай ізастужкай.

Сучасныя замежныя сякеры і калуны зараз вырабляюцца з пластыкавымі тапарышчамі. На будаўнічым рынку бачыў некалькі варыянтаў. Дэманструючы гнуткасць, у адным выпадку прадавец усёй сваёй вагой скакаў на такое тапарышча, маўляў, усё вытрымае (на рэкламных буклетах з тымі ж наступствамі на пластык наязджае кола цяжкай тэхнікі). Гандляры сцвярджалі, што яно не пашкодзіцца нават у выніку ўдару па ім кувалдай, або калі з размаху патрапіш ім па

калодцы пры кідку цуркі праз плячо. Другі варыянт — таксама трывалы і лёгкі пластык, арміраваны шкловалакном, з дзяржаннем, што не дае руцэ саслізнуць. Такое тапарышча было зроблена пустацелым, падобным на трубчастую «костку». Як запэўнівалі мяне гандляры, такая асабліваць гасіць вібрацыю, што пасля няўдалага ўдару па цурцы праз тапарышча перадаецца рукам (наколькі гэта можа быць балюча-непрыемным — не мне тлумачыць). Адзінае, што засмуціла, дык гэта магчымасць карыстання сякерай ці калуном з такімі тапарышчамі падчас маразоў. І хоць самі прадаўцы сцвярджалі, што нічога ім не зробіцца, даводзілася чуць і іншыя меркаванні: пры мінусавых тэмпературах ёсць рызыка, што пластык будзе крохкім...

### СПОСАБ НАСАДКІ

Ад яго залежаць не толькі вашы хуткасць і якасць пры нарыхтоўцы дроў, але і бяспека «лесаруба» і навакольных. Уявіце, «снарад» якой вагі можа пры замаху зляцець з тапарышча? Існуе некалькі спосабаў насадкі сякеры ці калуна. Самы надзейны — гэта калі адтуліна ў іх пад тапарышча ідзе на конус, і яно дастаткова шырокае, каб сякеру ці калун можна было насадзіць з рукаяткі. Згаданы мной вышэй калун вагой 3,6 кілаграма з пластыкавым тапарышчам быў насаджаны менавіта такім чынам, што толькі надавала інструменту «ачкоў». Тут бяда будзе, толькі калі зламаецца само тапарышча. А вось лягчэйшы «сабрат» калуна і шматлікія сякеры з рынку былі насаджаны на такія ж пластыкавыя тапарышчы «гарачым спосабам». Значыць, калі не пашчасціла і сякера зляцела, самастойна на тапарышча вы яе ўжо не насадзіце як след.

Для драўляных тапарышчаў найбольш распаўсюджаным з'яўляецца спосаб насадкі з клінам: драўняным ці металічным. У экстранных выпадках абыходзяцца нават металічнымі цвікамі, якія набіваюць у тарэц тапарышча. Калі спосаб насадкі з клінамі, то перад працай (асабліва калі інструментам не карысталіся працяглы час) сякера ці калун замочваецца ў вадзе на некалькі гадзін, прычым, так, каб вада пакрывала менавіта месца насадкі.

На будаўнічым рынку мне расказвалі, што ў некаторых адносна дарагіх мадэлях замежных сякер і калуноў з драўлянымі тапарышчамі (такое спалучэнне для якаснай імпартнай прадукцыі зараз сустракаецца не вельмі часта) у якасці кліна выкарыстоўваецца спецыяльны штучны матэрыял. Ён паводзіць сябе процілеглым чынам у параўнанні драўнінай (напрыклад, цвёрдаму арэху, з якога з-за яго трываласці яшчэ вырабляюць бейсбольныя біты): калі драўніна высыхае, такі клін пашыраецца, калі тапарышча набрыняла вільгаццю — сціскаецца. Ва ўсіх выпадках забяспечваецца надзейнае мацаванне сякеры з тапарышчам.

### ШТО ПА ЧЫМ І ДЗЕ?

У крамах сталіцы выстаўлена пераважна прадукцыя айчынных вытворцаў, расійскіх, польскіх і кітайскіх. Да прыкладу, беларуская будаўнічая сякера каштуе крыху больш за 27 тысяч рублёў, універсальная — амаль 21 тысячу. За столькі прадаваўся і калун на доўгім тапарышчы, але — літы... Польскія сякеркі можна купіць па цане 34—49 тысяч, кітайскія — 34—41 тысячы рублёў. Дровы апошнімі, праўда, не пасячэш. Тапарышчы ў крамах каштавалі ад 5,5 тысячы да 7,5—8,2 тысячы рублёў (апошнія больш прыдатныя). Адзінае, што, на мой погляд, атрымалася адшукаць з карыснага для свайго выпадку, — уральская каваная сякера коштам 44 тысячы рублёў.

На будаўнічых рынках выбар таксама не вельмі багаты: сякеры і калуны пераважна польскай вытворчасці і быццам бы нямецкай, ці, як казалі самі прадаўцы, зробленай пад іх кантролем (падазраю, што насамрэч гэта — Кітай). Калуны на доўгіх пластыкавых тапарышчах каштавалі 70—80 тысяч рублёў. На сякеры, насаджаныя «гарачым спосабам», шчыра кажучы, нават не звяртаў увагі. Праўда, і тут былі свае «іскрынкі». Скажам, каваныя сякеры яшчэ савецкай вытворчасці. Сам трымаў у руках такую — 1955 года выпуску, як было пазначана на кляйме. Як заўважыла прадавец, такія сякеры ў іх — усе да 1960 года выпуску. Відавочна, што гэта рэшткі запасаў колішняй Савецкай Арміі, інжынерных войскаў, ад якіх, напэўна, было вырашана пазбавіцца. «Паслухайце, якой якасці сталь, яшчэ тагачаснай, як гучыць. Не тое, што гэты польскі «пластылін». Прадавалі іх па 50 тысяч рублёў.

Прыцягнулі ўвагу і фінскія сякеры і калуны (гэта якія з пластыкавымі трубчастымі тапарышчамі). Нязвыкла лёгкія, асабліва ў параўнанні са звычайнымі стальнымі калунамі. Лязо такога інструмента пакрыта тэфлонам, што зніжае трэнне. Плюс адмысловыя вуглы заточкі ляза, пралічаныя на камп'ютары, надзейнае мацаванне. Усё гэта, па словах прадаўца, робіць сякеру ці калун надзвычай лёгкім і зручным пры выкарыстанні: захраснуць у цурцы такі інструмент не можа па вызначэнні. Ён або рассякае тую цурку, або адскоквае ад яе. На тапарышча даецца гарантыя на 10 гадоў. Праўда, крыху засмуцілі адказы гандляра наконт заточкі сякеры: самастойна такую работу (а рана ці позна яна ўсё адно спатрэбіцца) належным чынам зрабіць будзе цяжка. Ну, і цана была немалая. За калун з сярэднім тапарышчам прасілі 170 тысяч, за сякеру з доўгім — столькі ж, калун з доўгім тапарышчам каштаваў 190 тысяч рублёў. Добры інструмент, бясспрэчна, каштуе добрых грошай, але названая апошняй лічба, скажам, гэта кошт дзвюх трацін трактарнага прычэпа гатовых — папілаваных і пасечаных — дроў, калі заказваць іх праз гарпаліва.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Нічога асабістага!

# ТАВАРЫШ ПАСАЖЫР, А Ў ЦЯБЕ ХАТА З КРАЮ?

— Вадзіцель! Вадзіцель, спыніце, калі ласка, вунь ля таго знака, — чуецца жаночы голас з глыбіні маршруткі, якая нясецца па вузкай сталічнай вулачцы аднаго са спальных раёнаў. — Ага, ну вунь ля знака — «Небяспечны паварот»...

От так жа ж прынцып — «на плоце таксама шмат чаго напісана, а там — дровы». Не важна, што «небяспечны», галоўнае — спыніцца менавіта тут. Пажар? Не-а, проста на 30 крокаў бліжэй да дому...

Наогул, ад паездак у грамадскім транспарце часам можна атрымліваць асалоду, якая прымушае нават забыцца на свой стан кількі ў бляшанцы і іншыя «чароўнасці» слова «грамадскі». Такія тэатральныя дзеі можна пабачыць, што і спецыяльна не прыдумаеш. Унь літаральна пазаўчора п'яненькі мужычок выйшаў з тралейбуса разам са мной на адным прыпынку і спытаў, дзе ён знаходзіцца. Пасля нядоўгіх тлумачэнняў з майго боку рэзюмаваў:

— Дажыўся, блін: я, таксіст, — і заблукаў у горадзе!..

Разам са смешным сустракаюцца сітуацыі, над якімі варта задумацца. Вы не заўважылі, што мы з вамі нейкія абыякавыя? Калі пачынаюцца развівацца якія-небудзь нечаканыя падзеі, пасажыры, гэта значыць мы, чамусьці рэагуюць вельмі пасіўна, а лепей сказаць — ніяк не рэагуюць. Два разы даводзілася зрывацца з месца і сілай расціскаць дзверы аўтобуса, калі аднойчы нецвярозаму мужыку руку заціснула, а ў іншы раз малы хлопец не туды, куды трэба, кісць засунуў. І што адметна — крычыш іншым: «Скажыце там вадзіцелю, каб дзверы адчыніў», — а ўсе — нуль увагі. Сядзяць, маўчаць, і быццам у кожнага хата сапраўды з краю стаіць. Але заўважыў, што вось больш сталыя людзі не такія. Відаць, выхаванне ў духу калектывізму прабіваецца: па дарозе на рынак «Ждановічы» жанчыны ва ўзросце проста наўзахваткі раілі нейкаму дзеду, дзе лепей выйсці і на што перасесці... І ведаеце, страшна робіцца, што такіх людзей старой закваскі становіцца ўсё менш і менш, і хутка застанёмся толькі мы — эгаісты. Кожны сам па сабе. Кожны сам за сябе. Страшна!

Хаця нядаўна пераканаўся, што не ўсё страчана. Быў позні вечар, а мо і ноч. Адзін з апошніх напаўпустых тралейбусаў. На двух сядзеннях утульна размясціліся два хлопчыкі мо класа з 9-га, прычым размясціліся настолькі ўтульна, што нават ногі з бруднымі ботамі на сядзенні насупраць пазакідвалі. І едуць сабе, гаворку няспешна вядуць. А некалькі пасажыраў у салоне тут жа, але хлопцам заўваг не робяць. Маўляў, месцаў хапае, чаго нервы псаваць? І вось на прыпынку ўвальваецца пара-тройка не вельмі цвярозых хлапцоў. Ну такіх, простых. З завода. З раёна. З семкамі і ў спартовых штанах. І — о дзіва! — адзін з іх не паленаваўся прайсці праз увесь салон і схіліцца над дзевяцікласнікамі:

— Вы што, зусім абарзелі? У транспарце ездзіць не ўмееце?

І ці то ад такіх пераканаўчых словаў, ці то ад лёгенькага штуршка ў хлопцаў ногі самі спусціліся на грэшную падлогу. Ну можам жа вырашаць праблемы! Праўда, для гэтага трэба быць перш за ўсё людзьмі, а потым ужо пасажырамі...

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

На заметку

## Трамвай... напракат

**Кіраўніцтва віцебскага трамвайна-тралейбуснага ўпраўлення прапанавала гараджанам і гасцям горада новую паслугу — транспарт напракат.**

Як паведамілі «Звяздзе» ва ўпраўленні, нечаканая паслуга атрымала назву «Трамвай і тралейбус выхаднога дня». Першы выезд ужо адбыўся: самі работнікі ўпраўлення праехаліся па горадзе, каб абмеркаваць перспектывы і нюансы незвычайнай прапановы.

Мяркуецца, што паездка на арэндаваным тралейбусе будзе каштаваць 120—130 тысяч рублёў, адпаведна на трамваі — 160—170 тысяч рублёў. Пасажырам прапануюць экскурсійнае абслугоўванне: раскажуць пра гісторыю электрычнага транспарту Віцебска, горада ў цэлым. Дарэчы, нагадаю, Віцебск — самы першы горад у нашай рэспубліцы, дзе з'явіўся трамвай.

Для паездак выбралі маршруты трамвая — № 1, 7 і тралейбуса — № 4. Для тых хто дрэнна ведае абласны горад, паведамляю: гэта самыя працяглыя маршруты. А тралейбус № 4 праязджае па гістарычным цэнтры горада і паўз знакаміты Летні амфітэатр — сэрца «Славянскага базару ў Віцебску».

Новая ініцыятыва паслужыць і на карысць экалагічнаму выхаванню — рэкламуецца экалагічна чысты ад транспарту.

Ужо, дарэчы, ёсць ідэі праводзіць у трамваях і тралейбусах самыя розныя семінары. А чаму б

# «ВЫРАТАВАЛЬНІКІ» СВЕТУ САБРАЛІСЯ Ў ЛОНДАНЕ

**У сталіцы Вялікабрытаніі афіцыйна адкрыўся саміт Вялікай дваццаткі (G20). Мэта сустрэчы кіраўнікоў вядучых эканомік планеты — выпрацаваць эфектыўныя меры па выхадзе з сусветнага крызісу і спыніць глабальны працэс рэцэсіі, які пагражае ператварыцца ў цяжкую працяглую дэпрэсію з непрадказальнымі наступствамі.**

Як прадухіліць яе? Амаль кожная краіна прывезла ў Лондан свой план выратавання сусветнай эканомікі. Праўда, антыкрызісныя прапановы не заўсёды супадаюць. Дэлегацыі ЗША і Вялікабрытаніі лічаць, што перш-наперш трэба засяродзіцца на фінансавым сектары, каб надаць імпульс эканамічнаму развіццю ва ўсіх рэгіёнах планеты.

Расія і Кітай яшчэ загадзя аб'явілі аб неабходнасці самым уважлівым чынам разгледзець пытанне аб стварэнні рэзервовай сусветнай валюты, магчыма, нават і не адной. Як вядома, гэта ідэя не спадабалася Амерыцы. Прэзідэнт Абама і яго паплечнікі рашуча заявілі, што сёння амерыканскі долар моцны як ніколі і таму зараз шукаць яму замену не варта.

Францыя на шляхі выхаду з крызісу таксама мае свой пункт погляду, які падзяляюць многія краіны Еўрасаюза. У прыватнасці, гэта тычыцца ўзмацнення валютнага кантролю. Імпульсіўны французскі прэзідэнт Нікаля Сарказі нават заявіў, што ў выпадку непрыняцця эфектыўных мераў ён дэманстратыўна пакіне пасяджэнне дваццаткі. Бо яе ўдзельнікі не маюць права марнаваць час, калі свет знаходзіцца ў вялікай небяспецы.

Дарэчы, блізкая да расійскай і пазіцыя Германіі, куды напярэдадні саміту завітаў прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў. У Берліне ён яшчэ раз асабіста ўдакладніў сваю пазіцыю з канцлерам ФРГ. За дзень да сустрэчы ў Лондане стала вядома, што меркаванні лідараў гэтых уплывовых краін аб шляхах і спосабах выхаду з сусветнага крызісу ў многім супадаюць. Так што амерыканцам і англічанам будзе вельмі няпроста перакананць іншых удзельнікаў сустрэчы ў мэтазгоднасці прыняцця менавіта іх плана. Аднак усе прадстаўнікі Вялікай дваццаткі аднадушныя ў тым, што выходзіць з вельмі складаной сітуацыі неабходна разам, бо інакш поспеху не дасягнуць. Усе разумеюць, што няма іншага выбару перад тварам пагрозы новай Вялікай дэпрэсіі.

У Лондане прыняты беспрэцэдэнтныя меры па ахове парадку і жыцця лідараў дваццаткі і іх суправаджальных асобаў. Больш за пяць тысяч паліцэйскіх з сабакамі знаходзяцца ў стане поўнай гатоўнасці: уважліва сочаць за рухам транспарту, сітуацыяй на вуліцах і плошчах, назіраюць за будынкамі, дзе, магчыма, можа схавацца снайпер ці тэрарыст. Пад кантролем і неба над Лонданам, і марское ўзбярэжжа. Яшчэ 35 тысяч паліцэйскіх знаходзяцца ў рэзерве. 2 красавіка тысячы лонданскіх служачых установ, работнікаў арганізацый і фірмаў, якія знаходзяцца непадалёку ад месца правядзення саміту, атрымалі нечарговы выхадны.

Разам з прэзідэнтам Амерыкі ў Лондан прыехалі амаль 200 супрацоўнікаў службы бяспекі, прывезлі з Вашынгтона і асабісты лімузін Барака Абамы, які ў экстранным выпадку здольны вытрымаць ракетны ўдар. Для Абамы гэта першае еўрапейскае турнэ. У Лондане запланаваны яго перамовы, у прыватнасці, з кіраўнікамі Расіі і Кітая. Паліцыяй таксама прымаюцца папераджальныя меры па супрацьдзеянні верагодным акцыям пратэсту і маніфестацыям антыглабалістаў, анархістаў, рознага кшталту радыкалаў і іншых праціўнікаў ідэі правядзення саміту і ўвогуле ворагаў капіталізму.

Саміт Вялікай дваццаткі, безумоўна, — гэта з пачатку года падзея нумар адзін у свеце. І паўсюдна людзі чакаюць ад яго ўдзельнікаў канкрэтных і зразумелых рашэнняў, якія спыняць рост беспрацоўя, хвалю звальненняў і скарачэнняў, павысяць зарплату, вернуць упэўненасць у заўтрашнім дні. Аднак існуе і шмат сумненняў у тым, што адным толькі самітам можна спыніць развіццё крызісу.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

# Спрашчаем працэдуры падатковага адміністравання

Сёння адна з асноўных задач, якія стаяць перад падатковымі органамі, — стварэнне камфортных умоў для выканання плацельшчыкамі падатковых абавязацельстваў.

На дадзеным этапе неабходна ўсталёўваць з плацельшчыкамі прынцыпова новыя адносіны. Час пагроз, папярэджанняў аб неабходнасці плаціць падаткі адыходзіць, яму на змену ідзе добраахвотная плата падаткаў, якая з'яўляецца нормай жыцця законапаслухмянага плацельшчыка.

З развіццём інфармацыйных тэхналогій у 2009 годзе Міністэрствам па падатках і зборах пачата паэтапнае ўкараненне ў рэспубліцы сістэмы электроннага дэкларавання.

З увядзеннем электроннага дэкларавання плацельшчыкі падаткаў і збораў у Рэспубліцы Беларусь атрымаюць магчымасць падаваць падатковыя дэкларацыі (разлікі) па падатках, зборах (пошлінах) у электронным выглядзе, што з'яўляецца яшчэ адным крокам у спрашчэнні працэдуры выканання па-датковых абавязацельстваў, скарачэнні затрат працоўнага часу, як плацельшчыкаў, так і падатковых органаў і дазволіць перавесці работу з плацельшчыкамі на якасна новы ўзровень.

Першым этапам стала арганізацыя работы з сістэмай электроннага дэкларавання абмежаванай колькасці плацельшчыкаў г. Мінска і Мінскай вобласці ў рэжыме доследна-прамысловай эксплуатацыі.

Другім этапам з'яўляецца ўкараненне з 01.04.2009 г. у прамысловую эксплуатацыю сістэмы электроннага дэкларавання, карыстальнікамі якой могуць стаць усе плацельшчыкі — юрыдычныя асобы, індывідуальныя прадпрымальнікі і фізічныя асобы, якія хочуць выкарыстаць электронны спосаб падачы дэкларацый.

Для работы з сістэмай электроннага дэкларавання неабходна выканаць шэраг працэдур. Перш за ўсё неабходна зарэгістравацца ў якасці абанента засведчвальнага цэнтра РУП «Інфармацыйна-выдавецкі цэнтр па падатках і зборах» па адрасе: г. Мінск, пр-т Машэрава, 7, к. 227, які забяспечыць плацельшчыка ключамі электронна-лічбавага подпісу, і ўстанавіць праграмнае забеспячэнне.

У мэтах прыцягнення да электроннага дэкларавання большай колькасці плацельшчыкаў Міністэрства па падатках і зборах пастаянна праводзіць інфармацыйна-растлумачальныя семінары, вучобу і «прамыя лініі» па рабоце з электронным дэклараваннем. Таксама з інфармацыяй па ўкараненні электроннага дэкларавання можна азнаёміцца на афіцыйным сайце Міністэрства па падатках і зборах (www.nalog.by).

Яшчэ адным крокам выкарыстання інфармацыйных тэхналогій з'яўляецца ўкараненне і расшырэнне інтэрактыўных тэрміналных плацежна-даведачных сістэм (інфакіёскаў).

З дапамогай такіх сістэм фізічныя асобы, якія адкрылі карт-рахунак у банку, маюць магчымасць з дапамогай карткі аплаціць любы падатак, збор, пошліну.

Прыём плацяжоў ажыццяўляецца праз інфакіёскі, якія належаць РУП «Белпошта» і ААТ «ААБ Беларусбанк».

Цяпер, сумесна з РУП «Белпошта», Міністэрства па падатках і зборах правяло доследную эксплуатацыю інфармацыйнай сістэмы платы падаткаў праз інфакіёскі, устаноўленую ў 24 падатковых інспекцыях рэспублікі.

У Магілёўскай вобласці плату падаткаў можна ажыццявіць праз любы інфакіёск ААТ «ААБ Беларусбанк», размешчаны ў г. Магілёве і больш чым у палове раённых цэнтраў.

Сёння праводзіцца работа па пытанні магчымасці платы падаткаў, збораў, пошлінаў у бюджэт плацельшчыкамі праз інфакіёскі, размешчаныя ў любым пункце рэспублікі.

Варта адзначыць, што ў інфакіёсках, якія належаць РУП «Белпошта», устаноўлена і функцыянуе ў дапамогу плацельшчыку інфармацыйна-даведачная сістэма Міністэрства па падатках і зборах.

Гэтая сістэма дазваляе атрымаць звесткі аб адрасах размяшчэння ўсіх падатковых інспекцый МПЗ, кіраўніках інспекцый, часе прыёму кіраўніка, аб адміністрацыйных працэдурах, якія ажыццяўляюцца падатковымі органамі рэспублікі ў дачыненні да юрыдычных і фізічных асобаў, індывідуальных прадпрымальнікаў; аб парадку абскарджання дзеянняў службовых асобаў падатковых органаў.

Як мы бачым, усе новаўвядзенні падатковых органаў рэспублікі накіраваныя на тое, каб дапамагчы падаткаплацельшчыку выканаць свой канстытуцыйны абавязак — выплаціць у бюджэт краіны падаткі.

**Аддзел інфармацыйна-растлумачальнай работы Міністэрства па падатках і зборах.**

# «ФУРЫ» ПРОСЯЦЬ РАБОТУ!

**Антыкрызісная эканоміка**

**У Гродне прайшоў рэгіянальны сход членаў Беларускай асацыяцыі міжнародных аўтамабільных перавозчыкаў (БАМАП). Як паўплываў на іх працу сусветны фінансава-эканамічны крызіс? Калі ў мінулым годзе ў вобласці быў дасягнуты небывалы рост экспарту транспартных паслуг, то сёлета перавозчыкі сталі ездзіць значна менш. Паводле інфармацыі філіяла транспартнай інспекцыі па Гродзенскай вобласці, у параўнанні з першым кварталам мінулага года нашым перавозчыкам было выдадзена на 15 працэнтаў дазволаў больш, аднак выкарыстанне іх дрэннае.**

Калі хапала працы ўсім, то гродзенскія перавозчыкі больш арыентаваліся на транзіт, але цяпер спадзяюцца і на ўнутраны рынак. Аднак і тут сітуацыя даволі складаная і пры гэтым не заўсёды грунтуецца на эканамічнай эфектыўнасці.

**ЯК НЕ ПАЗБАВІЦЦА ЛІЗІНГАВАГА ТРАНСПАРТУ?**

Як выжыць нашым транспартным прадпрыемствам ва ўмовах скарачэння экспартных паслуг і ўвогуле аб'ёмаў перавозак? Ужо цяпер, паведаміў **член праўлення БАМАП, лідчанін Іван БУЙКО,** некаторыя банкі, лізінгавыя кампаніі пачалі забіраць транспарт у нашых перавозчыкаў.

— Мы іх прасілі падысці з разуменнем да сітуацыі, што склалася на рынку міжнародных перавозак, па магчымасці адтэрміноваць лізінгавыя плацяжы, але яны не хочуць, — адзначыў Іван Буйко. — Таму мы павінны выпрацаваць адзіную пазіцыю, каб не атрымалася так, што ў нашых калег забралі транспарт, а мы гэтаму радуемся альбо, яшчэ горш, гэтыя аўтамабілі купляем. Нельга зарабляць на чужой бядзе, якая можа чакаць кожнага з нас. Няхай гэтыя машыны пастаяць і банкі, лізінгавыя кампаніі, спадзяюся, зразумеюць, што ў дыялогу з намі трэба займаць канструктыўную пазіцыю, паколькі сёння ў Беларусі не дэфіцыт, а, мажліва, нават лішак транспарту.

**«ВАШЫ ПАСЛУГІ НЕ ПАТРЭБНЫ...»**

У Беларусі сёння шмат прамысловых прадпрыемстваў, якія працуюць і на экспарт, і на імпарт. Аднак уклініцца ў гэтыя перавозкі, адзначалася на сходзе, апошнім часам практычна немагчыма. У аддзеле маркетынгу кажуць: «Вашы паслугі не патрэбны». Але ў той жа час і па экспарце, і па імпарце з нашымі прадпрыемствамі працуюць транспартнікі з Літвы, Расіі, Польшчы, Украіны. Пры гэтым грашовыя стаўкі, якія закладзены ў кантрактах, здараецца, даволі цікавыя. Атрымліваецца, што чужаземец вязе груз па цане ў паўтара-два разы вышэйшай за тую, па якой гэта мог бы зрабіць беларускі перавозчык.

— Няўжо гэта звязана з нейкімі сваяцка-сяброўскімі кланамі, куды нам не прабіцца? — задаецца пытаннем адзін з перавозчыкаў. — Але ж мы можам везці груз танней і пры гэтым за беларускія рублі. Пасля купім у банках валюту і заплацім лізінгавыя плацяжы. Тым самым мы захаваем у нашай дзяржаве валюту, рабочыя месцы. Аднак сітуацыя іншая. Для нас работы няма, мы прастойваем, фрахты падаюць, але ў той жа час грузы проста ў нас «пад носам» забіраюць замежныя перавозчыкі.

**ТРАНСПАРТ ВЕДАМАСНЫ. А ЦІ ЭФЕКТЫЎНЫ?**

Ва ўмовах антыкрызіснай эканомікі выйграе той, хто працуе больш эфектыўна. Зразумела, што гэта датычыцца ў тым ліку і транспарціроўкі грузаў. І вось тут пытанне: а хто ж больш эфектыўна выкарыстоўвае транспарт? Захад, дзе, як прагучала на гродзенскім рэгіянальным сходзе членаў БАМАП, ні на адным прадпрыемстве няма транспартных цэхаў? Альбо нашы прадпрыемствы, дзе з'яўляецца нормай мець уласныя аўтабазы, але пры гэтым далёка не заўсёды лічыць затраты на іх утрыманне, якія, зразумела, укладваюцца ў цану прадукцыі?

На думку Івана Буйко, выкарыстанне транспарту на спецыялізаваных прадпрыемствах у параўнанні з ведамасным значна больш эфектыўнае: «Ёсць прапанова паспрабаваць хоць на адным прадпрыемстве выдзяліць транспарт у асобнае падраздзяленне са сваім разліковым рахункам і абавязкамі. Даю гарантыю, што яно праз год будзе банкрутам».

Дык ці патрэбны ведамасны транспарт? А з іншага боку, ці кожнае спецыялізаванае транспартнае прадпрыемства, якое хоча заняць яго нішу, будзе больш эфектыўным у параўнанні са сваімі ведамаснымі калегамі?

...Як паведаміў на сходзе **начальнік аддзела транспарту і камунікацый Гродзенскага аблвыканкама Віктар ПЯТКЕВІЧ,** «нас таксама хвалюе неэфектыўнае выкарыстанне транспарту на прамысловых прадпрыемствах і ў арганізацыях». Міністэрству эканомікі ўнесена прапанова аб квотах для ведамаснага транспарту. Каб у міністэрстве праводзілася абарона неабходнасці транспарту для тэхналагічных патрэбаў.

Што датычыцца міжнародных перавозчыкаў, то цяпер, згодна з інфармацыяй Віктара Пяткевіча, праводзіцца работа па фарміраванні лагістычных цэнтраў у Гродне і Лідзе. З іх з'яўленнем будуць зроблены сур'ёзныя крокі па сістэмнай арганізацыі міжнародных грузавых перавозак.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

# ПОШЛІНА — ПА-НОВАМУ

**З 1 студзеня 2009 года ўвайшлі ў сілу шэраг змяненняў, якія ўнесены ў Закон Рэспублікі Беларусь ад 10 студзеня 1992 года «Аб дзяржаўнай пошліне». Што з'явілася новага ў выплаце дзяржаўнай пошліны за ажыццяўленне натарыяльных дзеянняў?**

**Аркадзь КРАЎЧАНКА,** *г. Мінск.*

Як расказаў карэспандэнту агенцтва «Мінск—Навіны» загадчык аддзела Аляксандр Стэфановіч, каталог будзе змяшчаць вычарпальную інфармацыю аб кнігах з бібліятэкі Нясвіжскай ардынацыі Радзівілаў. Работу мяркуецца завяршыць да 2015 года.

Бібліяграфічнаму ўліку помнікаў кніжнай культуры прыватнаўладальніцкіх калекцый, якія існавалі на тэрыторыі Беларусі, супрацоўнікі ЦНБ НАН надаюць вялікую ўвагу. У гэтым спісе таксама зборы Храптовічаў, Сапегаў і прадстаўнікоў іншых знатных родаў.

Фонды аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН — гэта 65-тысячны збор рэдкіх рукапісных кніг і старадрукаваных выданняў. А таксама ўнікальныя калекцыі прадукцыі, выдадзенай у друкарнях Еўропы, у тым ліку і на тэрыторыі Беларусі з пачатку XVI стагоддзя да нашага часу. Захоўваюцца тут і выданні пра Беларусь. Кнігі і дакументы напісаны на больш чым 20 мовах народаў свету.

**Людміла ПРЫХОДЗЬКА, «Мінск—Навіны».**

## Птушка года. Шэрая гусь

***31 сакавіка 2009 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь увяло ў паштовае абарачэнне марку «Шэрая гусь» з серыі «Птушка года», падрыхтаваную ВЦ «Марка» РУП «Белпошта».***

***Мастак Аляксандр Міцянін.***

Марка падрыхтаваная пры садзейнічанні грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны».

Рашэннем грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» птушкай 2009 года ў Беларусі аб'яўлена шэрая гусь.

# ТЭАТР, ЯКІ ВЕДАЕ САБЕ ЦАНУ

## Прыхільнікі оперы і балета пачынаюць адкладаць грошы на квіткі

### Дарагое мастацтва

Тэатр да і пасля рамонту — гэта нібыта два розныя тэатры. Прычым, гэта так па розных параметрах: артысты працуюць у новых умовах, спектаклі адаптуюцца да рэканструяванай сцэны. І гледачы пачынаюць адаптавацца ўжо з фае, працягваюць у зале з новымі крэсламі. Але зразумеюць, за што заплацілі, яны ўсё-такі пасля прагляду спектакля. Аматарам оперы і балета трэба разумець, што прыход у адрамантаваны тэатр для іх павінен стаць сапраўдным святам, за якое ніякіх грошай не шкада. Журналісты аднымі з першых гэта маглі адчуць і пачуць.

Кошт квіткоў у Вялікі тэатр оперы і балета Беларусі будзе цяпер больш высокі, чым дагэтуль. Чакаецца, што 80 тысяч рублёў будзе каштаваць квіток у партэр на балетны спектакль. На оперу самы дарагі квіток абыдзецца ў 30 тысяч рублёў. «Тэатру дазволена мяняць цану ў залежнасці ад кан'юнктуры, — адзначыў галоўны дырыжор аркестра тэатра Віктар Пласкіна. — Натуральна, мы будзем рабіць і дабрачынныя канцэрты».

Першы спектакль у Вялікім тэатры оперы і балета Беларусі пройдзе 3 красавіка. Гледачы змогуць пабачыць балет «Лебядзінае возера». Тэатр пачынае з балетных спектакляў таму, што іх прасцей адаптаваць да новых умоў, чым оперу — усё-такі балет падчас рамонту працаваў на вялікай сцэне Палаца Рэспублікі. Першы оперны спектакль «Набука» пройдзе 24 красавіка. Пасля яго плануюць паказаць «Тоску» ў канцэртным выкананні, таму што шмат сцэнічных рэчаў яшчэ не гатовыя. Некалькі спектакляў пройдуць у канцэртным выкананні.

### Фантастычныя ўмовы

Галоўнай задачай оперная трупа вызначыла адаптацыю спектакляў, якія былі ў яе рэпертуары, да вялікай сцэны тэатра.

«Мы заходзім у тэатр, які сёння мае каласальную суперапаратуру. Але ў нас няма людзей, якія могуць на ёй працаваць, — падкрэсліў Віктар Пласкіна. — У нас фактычна касмічны карабель, на якім працуюць трактарысты. Два тыдні немцы навучалі нашых супрацоўнікаў, але гэтага вельмі мала. Нам патрэбны час, каб асвойтацца».

Дырыжор збіраецца прыцягваць маладых калег да працы ў аркестры. На яго думку, аркестр — гэта фундамент, на якім опера будзе творча расці. Аркестр тэатра задаволіў свае патрэбы ў інструментах працэнтаў на 40. Купілі яшчэ не ўсё, бо працэс гэта даволі складаны і марудны. Але калі ведаеш, чаго чакаеш, то можна і пачакаць...

«Што рабіць з вакалістамі? Іх у нас вельмі шмат — каля 70 чалавек. Нам столькі не трэба. Галоўнае ж не ў колькасці, а ў якасці. Таму трэба правесці атэстацыю напрыканцы сезона ці ў пачатку новага. Тыя, хто ўжо не можа спяваць, павінны будуць з намі развітацца. Асаблівая каста — народныя артысты. Зразумела, іх ніхто не стане праганяць з тэатра, якому яны прысвяцілі жыццё. Няводнага заслужанага чалавека мы не звольнім».

### Цэнтр кіравання палётамі

У цяперашні час абавязкі галоўнага дырэктара выконвае Валянцін Панцялеевіч Пышной. Не так проста падабраць кандыдатуру на пасаду Генеральнага дырэктара тэатра.

«У шмат якіх тэатрах Еўропы і Расіі такіх пасад увогуле няма. Сутнасць у тым, што прафесійных дырэктараў оперных тэатраў практычна няма. Каб іх выхаваць, патрэбны час. У Беларусі ў оперным тэатры прапушчаны гэты момант, — патлумачыў Віктар Пласкіна. — Я лічу, што няправільным было раз'яднанне тэатра. Цудоўна развіваўся балет, але ў оперы намеціўся спад пасля сыходу Сяргея Картэса з пасады дырэктара. Вядома, умовы былі не лепшыя для яе развіцця ў апошнія гады, пляцоўка Дома афіцэраў не вельмі падыходзіла для паўнавартаснай працы тэатра. Дзякуй богу, што опера больш-менш выжывала ў гэтых умовах. Малайчына Валянцін Мікалаевіч Елізар'еў, які на час рамонту здолеў перасяліць балет на сцэну Палаца Рэспублікі. Міністэрства яму ў гэтым дапамагло, а оперы дапамаглі менш. Наша задача — выправіць сітуацыю, вывесці оперу на належны ўзровень. Цяпер у тэатры практычна ўкамплектаваны штат галоўных спецыялістаў — галоўны дырыжор, хормайстар, балетмайстар, мастак. Няма пакуль галоўнага рэжысёра. Хацелася б, каб гэтую пасаду заняў чалавек, які знаёмы з сучаснай рэжысёрскай мовай. Мы зацікаўлены, каб ён максімальна выкарыстоўваў новыя тэхнічныя магчымасці. Мы хацелі б зрабіць стаўку на тых асобаў, якія нарадзіліся ў Беларусі, працавалі тут і па розных прычынах з'ехалі. Цяперашні стан тэатра оперы і балета Беларусі, яго новае абсталяванне прыцягваюць увагу шмат якіх асобаў, і ёсць прапановы супрацоўнічаць, але мы не спяшаемся. Праяўляюць цікавасць да тэатра як нашы фірмы, так і замежныя імпрэсарыё».

### Вялікі — на адлегласці

Оперны тэатр падпісаў кантракт з галандскай фірмай на пастаноўку спектакля «Трубадур». Праект будзе ажыццяўляцца ў Беларусі, але ўся пастановачная група галандская. Кажуць, што гэты спектакль будзе выкананы ў эстэтыцы, якая зараз бытуе ў Еўропе. Яго пакажуць у Галандыі, і беларускія гледачы змогуць яго паглядзець.

«Былі некалі планы пастаноўкі балета «Клеапатра», праект задумваўся Елізар'евым, — сказаў Віктар Пласкіна. — Дзверы тэатра для яго не зачыненыя. Ён жа сам сышоў. Напэўна, час усё паставіць на свае месцы».

У наступным сезоне з балетам будзе супрацоўнічаць вучань Елізар'ева Раду Паклітару, ажыццяўляючы пастаноўку на музыку Ніна Рота. У бок суседняй Расіі паглядае і опера. Ужо вядуцца перамовы з рэжысёрам Аляксандравым з Санкт-Пецярбурга наконт пастаноўкі ў Мінску оперы «Барыс Гадуноў». Галоўны дырыжор аркестра тэатра лічыць, што больш мэтазгодна ў беларускім тэатры ставіць рускую оперную класіку. «Не трэба рабіць дрэнныя спектаклі на французскай мове, на нямецкай, на італьянскай. Таму што фанетыку гэтых моў артысты дрэнна ведаюць, і часам гэта смешна гучыць». Напэўна таму збіраюцца аднавіць у рэпертуары оперу «Хаваншчына» Мусаргскага ў пастаноўцы Маргарыты Елізар'евай, над якой таксама працаваў Генадзь Праватораў.

### «Чужое багацце нікому не служыць»

Прэм'еру беларускай оперы пад такой назвай збіраюцца падрыхтаваць да канца гэтага сезона. На пастаноўку оперы Яна Голанда, якая была напісана ў Нясвіжы, тэатр атрымаў гранд прэзідэнта — праца будзе каштаваць каля 80 тысяч доларaў.

«Мы абавязкова падрыхтуем вялікі канцэрт беларускай оперы, — адзначыў Віктар Пласкіна. — Мы занепакоены ўзроўнем прысутнасці ў беларускім тэатры спектакляў беларускай тэматыкі, твораў беларускіх аўтараў. У нас іх няшмат — Глебава, Солтана, Кузняцова. Сталі прыходзіць да нас беларускія кампазітары са сваімі ідэямі — Андрэй Мдзівані, Дзмітрый Смольскі. Валянціна Коўтун заклапочана тэмай Ефрасінні Полацкай, якую можна было б увасобіць у оперы. Каб квітнела нацыянальная опера, на маю думку, можна было б правесці конкурс, з шэрагу прац выбраць адну, якую паставілі б. І кампазітару, які перамог у конкурсе, можна было б заплаціць ганарар. Ва ўсе часы ў любым тэатры існавала праблема рэпертуару».

**Падрыхтавала Ларыса ЦІМОШЫК.**

# Некалькі эпізодаў пра мову

Наўздагон

Захацелася напісаць колькі слоў пасля серыі матэрыялаў, прысвечаных Дню роднай мовы, што публікаваліся як у мінскіх, так і ў мясцовых, брэсцкіх газетах. Гэтыя публікацыі прымусілі ўспомніць пра некаторыя эпізоды, звязаныя з нашай моўнай сітуацыяй, сведкам або ўдзельнікам якіх давялося быць.

*Эпізод першы.* «Я заговорю по-белорусски тогда, когда в магазинах будет двадцать сортов колбас» — гэтак калісьці, гадоў трынаццаць-чатырнаццаць таму, заявіла выкладчыца гісторыі педагогікі падчас сваёй лекцыі студэнтам у адказ на прапанову чытаць лекцыі на беларускай мове.

Нейкі час назад дзеля цікавасці пералічыў колькасць гатункаў каўбасы ў звычайнай тыповай брэсцкай краме. Атрымалася нашмат больш за дваццаць. Нядаўна бачыў і чуў тую выкладчыцу. Гаворыць па-ранейшаму...

Думаю, што яна даўно забыла свае словы, а ў момант, калі гаварыла іх, была упэўненая, што ставіць невыканальную ўмову беларускім вытворцам, дзейнасць якіх яна зрабіла ўмоваю ўласнай лінгвістычнай рэвалюцыі.

Цікава, калі б сёння задаць ёй тое самае пытанне? Колькі трэба каўбасы для выканання ўмовы? Сто гатункаў? Дзвесце?

Ці сумленны ўвогуле быў той адказ? Напэўна, не. Таму і не варта перапытваць чалавека, зноў псаваць настрой беднай кабеце. Хай будзе задаволеная тымі каўбасамі, мара пра якія спраўдзілася. Не дай Божа самому калі-небудзь сказаць падобнае.

*Другі эпізод.* Студэнт з правінцыі на малодшых курсах глядзіць на прафесара або дацэнта як на намесніка Бога на зямлі. Гэтага пачуцця не было ў адносінах да выкладчыцы беларускай літаратуры, што блытала словы «табе» і «цябе» («я цябе гаварыла»). У адказ на заўвагі — істэрыка непрыняцця крытыкі з пераходам на трасянку...

*Трэці эпізод.* Па дапамогу звярнуўся мужчына побач з банкаматам, які не мог самастойна зрабіць нейкую аперацыю. Я пачаў рабіць запатрабаваныя крокі, а чалавек у бядзе падрыхтаваўся назіраць і запамінаць паслядоўнасць дзеянняў. Першы ж крок добрага самарытаніна выклікаў у яго паніку: «Почэму по-белорускі? Почэму по-белоруски?». Ён нават думкі не дапускаў пра тое, што сярод прапанаваных банкаматам варыянтаў моў можна выбраць беларускую...

*Чацвёрты эпізод.* На мінулагоднім свяце беларускага пісьменства ў Барысаве. Жонка звярнулася з пытаннем пра дарогу да старога чалавека, па выглядзе тутэйшага жыхара. Перш чым адказаць, прагучалі словы: «Дзякуй за беларускую мову». Потым з сумессю крыўды і жалю: «Самі ўсё сваё патапталі» і, нарэшце, словы пахвалы тагачаснаму віцэ-прэм'еру Косінцу, што ў часе падрыхтоўкі да свята загаварыў з барысаўскім чыноўніцтвам па-беларуску.

*Пяты эпізод.* У часе работы ў Камітэце дзяржаўнага кантролю Брэсцкай вобласці даводзілася штотыдзень рыхтаваць інфармацыю пра завершаныя Камітэтам праверкі ды іх вынікі, што зводзіліся, як правіла, да выкрыцця парушэнняў і адпаведнага пакарання за іх.

У гэтай рабоце для сябе ўзяў за правіла рыхтаваць інфармацыю для беларуска- і двухмоўных выданняў па-беларуску. Гэта адразу стала выгадна выдзяляць яе ад матэрыялаў міліцыі, пракуратуры і іншых падобных структур. Каля паловы начальнікаў упраўленняў і аддзелаў абласнога дзяржкантролю сталі ўносіць праўкі, у выпадку такой патрэбы, па-беларуску.

*Шосты эпізод.* Калі ісці па Пружанах ад аўтастанцыі ў кірунку цэнтра, то разнастайныя надпісы выкананы, як правіла, па-руску. Пачынаючы ж ад сабора Аляксандра Неўскага і ў кірунку Палацыка, па вуліцы Савецкай (былой Замкавай), большае беларускіх шыльдаў. Чаму так? У 2003 годзе горад перажыў вялікую рэканструкцыю ў сувязі з рэспубліканскімі «Дажынкамі». Незадоўга да падзеі старшыня Пружанскага райвыканкама А. Юркевіч даў інтэрв'ю пружанскай газеце «Раённыя будні», у якім паведаміў, што пасля рэстаўрацыі шыльды ў горадзе будуць пераствораныя па-беларуску, у выпадку патрэбы — з дубляжом па-англійску. Такім чынам, будзе захаваная вонкавая беларускасць горада. З пачаткам рэстаўрацыі будаўнікі сталі выконваць надпісы па-руску. Неўзабаве «раёнка» змясціла падборку здымкаў абноўленых шыльдаў і ўрывак з інтэрв'ю пра беларускасць з красамоўным подпісам «А Васька слухае...» Крытыка падзейнічала. Пасля гэтага водгуку ў той частцы горада, якая яшчэ не была прыведзена да ладу, афармленне стала весціся па-беларуску.

*Сёмы эпізод.* На сустрэчы з работнікамі раённага спажывецкага таварыства ў Камянцы. Простыя жанчыны-прадаўшчыцы, здавалася б, далёкія ад моўных праблем. Пры гэтым пытанні, якія пайшлі з аўдыторыі, прыемна здзівілі: чаму раённая газета пачынае адмаўляцца ад беларускай мовы? Чаму зніклі беларускамоўныя праграмы з БТ? («Первым национальным» у свядомасці жыхара правінцыі канал яшчэ не стаў.)

Пра першае пытанне рэдактар газеты быў праінфармаваны. Аўтар другога мог бы знайсці адказ у той жа «Звяздзе», якая расказала пра вынікі сустрэчы старшыні ТБМ і кіраўніка Белтэлерадыёкампаніі.

Падвядзём пэўны вынік.

Па двух першых прыкладах. Дзякуй выкладчыцам, кожная з іх па-свойму паспрыяла станаўленню жыццяпогляду.

Эпізоды з трэцяга па шосты адкідаюць старое клішэ апанентаў сучаснага ладу пра антыбеларускасць улады.

«Не бойцеся пахваліць уладу, калі яна робіць вартую справу», — сказаў калісьці ў адным са сваіх інтэрв'ю кіраўнік ТБМ Алег Трусаў.

У рэальнасці — часта іначай. Колькі, напрыклад, гвалту было і ёсць з боку «культурной и образованной части» жыхароў Брэста на адрас запланаванага помніка ў гонар тысячагоддзя горада. І банальны, і пампезны, і правінцыйны... І ніхто не сказаў, што ў Брэсце ўпершыню ў Беларусі паўстануць у бронзе Вітаўт і Мікалай Радзівіл Чорны. За сваімі дробнымі амбіцыямі непрызнаных аўтарытэтаў ад мастацтва і манументальнай прапаганды не могуць падняцца такія дзеячы да ўсведамлення інтарэсаў большых, чым асабістыя.

Такім рупліўцам даўно трэба забыць свае словы пра «антынацыянальную ўладу». Згаданы закід не дзейнічае — сёння ў нас якраз улада косць ад косці беларуская, яна дакладнае люстэрка ўсіх плюсоў і мінусаў свайго народа.

Асабісты дзякуй героям чацвёртага і сёмага эпізодаў: вы і ёсць той «просты народ», які разбурае яшчэ адзін стэрэатып — што беларушына трэба толькі жмені гуманітарнай інтэлігенцыі.

Герою трэцяга эпізоду. Вы — сімптом нашай цяжкай хваробы. Дзень, калі вы выбераце беларускую мову на экране банкамата, будзе сведчаннем таго, што хвароба адыходзіць.

**Ігар ГЕТМАН, галоўны спецыяліст аддзела па рабоце са СМІ Брэсцкага аблвыканкама.**

## Занатоўкі мастака

# Тры талеркі з халадцом

На сваё сямідзесяціпяцігоддзе мама накрыла стол і запрасіла гасцей. Адкаркоўвалася шампанскае і чырвонае віно, гаварыліся доўгія тосты, пілося лёгка і елася-закусвалася са смакам, жартавалася дасціпна і смяялася незнарочыста. Мама сачыла, каб ва ўсіх было поўна на талерках і няпуста ў келіхах.

«Пакаштуйце грыбы, я іх сама збірала. Рыба вельмі смачная. Каму яшчэ гарачай бульбы пакласці? Печаную курыцу з яблыкамі варта паспрабаваць. Пакаштуйце халадзец!» — мама частавала гасцей. Настрой у яе быў цудоўны. Госці казалі, як яны любяць і паважаюць маю маму. Яны жадалі ёй доўгага веку і здароўя.

«Чаму халадзец ніхто не пакаштаваў? Я так старалася, а ніхто не пакаштаваў і не ацаніў...»

Каб зрабіць яшчэ адну прыемнасць маёй маме, госці парэзалі бліскучы халадзец на скрылікі і расклалі па талерках.

Тут Галіна Васілеўская і распавяла гісторыю пра тры талеркі з халадцом.

У тысяча дзевяцьсот сорак шостым годзе сям'я Васілеўскіх атрымала кватэру на трэцім паверсе новага дома на вуліцы Чырвонай, што ў Мінску. Пераезд адбыўся якраз напярэдадні Новага года, таму ўлазіны вырашылі адсвяткаваць каля ўпрыгожанай ёлкі. Час быў паваенны галодны і асноўнай святочнай стравай мусіў стаць халадзец. Яго доўга варылі, потым разлілі ў тры талеркі, але а дзясятай вечара ўбачылі, што халадзец усё яшчэ не застыў, таму, паставіўшы талеркі ў начоўкі, вынеслі яго на гаўбец і пакінулі на марозе.

За дзесяць хвілінаў да Новага года хацелі Васілеўскія паставіць галоўную страву на стол, ды ўсе тры талеркі прапалі. Начоўкі стаялі на гаўбцы, а талерак не было. Залезці на трэці паверх не так і лёгка, паверхі высокія, без лесвіцы не дабярэшся. І як ты ўбачыш з зямлі талеркі з халадцом у глыбокіх начоўках?

«Гэта мужчыны з чацвёртага паверха скралі наш халадзец! Спусціліся на вяроўцы і забралі талеркі! Трэба хутчэй падымацца да іх, пакуль яшчэ ўсё не з'елі! Я ведаю гэтых вечна галодных мужыкоў з бліскучымі ваўчынымі вачыма!» — цётка Галіны Васілеўскай павяла сям'ю на чацвёрты паверх.

На званкі і грукат у дзверы ніхто не адгукаўся.

«Сякера! Нясіце сякеру! Будзем дзверы выломліваць! Я ведаю, яны тамака ёсць! Яны ядуць наш халадзец!» — закрычала цётка.

Адзін злодзей пашкадаваў дзверы і адчыніў іх. Рот у злодзея быў напханы халадцом так, што шчокі раздзьмуліся. Другі злодзей сядзеў за сталом, бліскаў злымі вачыма з-пад ілба і запіхваў у рот апошні кавалак халадца з першай талеркі. Ад такога дэманстратыўнага нахабства Васілеўскія ажно разгубіліся. Скарыстаўшы агаломшанасць прысутных, злодзей, што сядзеў за сталом, выцягнуў з рота відэлец і пачаў ім пароць халадзец у другой талерцы. Ён пароў яго абсліняным відэльцам, каб Васілеўскія пагідзіліся есці папораты халадзец і пакінулі яго агаладалым суседзям.

Здагадлівая цётка, ачомаўшыся ад пабачанага, схапіла трэцюю некранутую талерку з халадцом і выбегла з кватэры рабаўнікоў.

«Хай ядуць! Няхай задавяцца нашым халадцом! У нас яшчэ ёсць адна поўная і чыстая талерка! Пайшлі хутчэй, а то спознімся сустрэць па-чалавечы Новы год!»

Так Васілеўскія сустрэлі тысяча дзевяцьсот сорак сёмы год у новай кватэры з талеркаю смачнага халадца.

А сёлета мая мама адсвяткавала свой сямідзесяціпяцігадовы юбілей зноў жа з беларускім халадцом на святочным стале.

Еў той халадзец з хрэнам і я. Еў і думаю... Калі ў некага тры талеркі з халадцом, а ў кагосьці ніводнай, дык злачынства здарыцца абавязкова. Злачынства — форма голаду.

**Адам ГЛОБУС.**

## НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

Астэп ЛІПЕНЬ

# ЯМАХА

...А калісьці гадаваліся па-суседску. Я, як і належыць, у роднай хаце, ля сваіх бацькоў, а выхаваннем Юрасіка займалася бабуля, бо маці яго была надта занятая пошукамі чарговага мужчыны сваёй мары.

З усёй вясковай дзятвы Юрасік чамусьці хацеў сябраваць толькі са мной. Мяне ж, хваравітага і кволага, цягнула да старэйшых хлопцаў, якія мелі мапеды і матацыклы і ўмелі пастаяць за сябе. Выглядала гэта ўсё так: я паўсюдна ішоў за старэйшымі, а мой «верны хвосцік» Юрасік цягнуўся за мной.

Заканчвалася ж звычайна тым, што мяне падводзілі пад дурнога хату, і я трапляў у непрыемную гісторыю, а Юрасік слёзна прасіў маіх бацькоў дараваць мне. Як я пасля гэтага мог з ім не сябраваць?

Калі Юрасіку споўнілася год дванаццаць, яго маці, якая за гэты час некалькі разоў няўдала выйшла замуж і атабарылася ў Вільнюсе, сама занялася выхаваннем сына. Аднак кожнае лета ён прыязджаў да бабулі, і лепшага за яго сябрука ў мяне не было.

Мы доўга падтрымлівалі сувязі, перапісваліся. Затым нашы пісьмы і сустрэчы сталі рэдкімі, а з развалам Саюза зніклі зусім. Сустрэліся мы праз год пятнаццаць. І вельмі нечакана.

У той дзень я, асядлаўшы свой «ІЖ», прыехаў у наш вясковы магазін, каб закупіць мукі ды камбікорму для свіней. Стаў у чаргу. Але яна не рухалася, бо першым стаяў высачэзны, шыкоўна апраўнуты мужчына, які нічога не купляў, а толькі размаўляў з прадаўшчыцай з прыкметным прыбалтыйскім акцэнтам. Я міжволі прыслухаўся. Чую, што размова пра мяне пайшла. І тут прадаўшчыца ўсклікнула:

— Дык вось жа ён!

Мужчына павярнуўся да мяне тварам. Я пазнаў у ім Юрасіка, хоць за тыя гады, што мы не бачыліся, ён стаў больш падобны на вядомага кінаакцёра Сцівена Сігала. У шыкоўным касцюме ад Кардэна і ўсміхаўся галівудскай усмешкай. А я быў гатовы скрозь зямлю праваліцца, бо не на вяселле ж прыехаў. Але Юрасік, не звярнуўшы ўвагі на мой убор, моцна сціснуў мяне ў абдымках.

Так нічога і не купіўшы, я стрымгалоў паімчаўся дамоў. Забягаючы ў хату, ледзь жонку з ног не збіў.

— Пажар хіба? — незадаволена буркнула тая.

— Пажар не пажар, — адказаў я, адначасова голячыся і перапранаючыся, — а праз паўгадзіны, каб стол быў накрыты па найвышэйшай катэгорыі.

— З якой гэта нагоды?

— А з той, — адказваю, — што зараз да нас Юрасік у госці прыедзе.

— Юрасік? Няўжо той самы? — жонка ў мяне з мясцовых, таму добра яго памятае.

— Быццам бы і той, ды ў той жа час зусім іншы. Дык ты ўжо не падкачай з «палянай».

І жонка «не падкачала». Нават Юрасік, які не прымусіў сябе доўга чакаць, заўважыў, што не ў кожным рэстаране паспытаеш гэткіх страў. Жонка ж, задаволеная пахвалой, рада была старацца. А затым пайшла ў залу, каб паслаць пасцель дарагому госцю. Вось тады я, не хаваючы зайздрасці, і сказаў Юрасіку:

— Што ні кажы, а табе ў жыцці больш пашанцавала. Ну што я пакіну сваім дзецям? Хату, якая мне ад бацькоў засталася? А ў цябе фірма, якая застанецца твайму адзінаму сыну.

— Каб жа адзінаму... — цяжка ўздыхнуў сябрук. — У мяне яшчэ трое ёсць.

— Ну, ведаеш... — азіраючыся, каб не пачула жонка, прамовіў я. — Я таксама не святы, але да тых дзяцей...

Юрасік не даў мне дагаварыць:

— Ты не так зразумеў, — і паведаў сваю гісторыю з сынам.

Юрасік на самай справе вельмі багаты. Багаты да такой ступені, што на чатырнаццацігоддзе сына дазволіў сабе купіць яму ў падарунак матацыкл за дзесяць тысяч долараў — «Ямаху», якая набірае хуткасць да чатырохсот кіламетраў у гадзіну. Юрасік калі быў маладзейшы, займаўся мотаспортам і сабраў калекцыю рэдкіх матацыклаў, у якой нават ёсць «Чырвоны Касцрычнік» і BMW даваеннага года выпуску. Калі ж купіў тую злашчасную «Ямаху», сказаў сыну:

— Калекцыя мая. Тут я табе магу толькі дазволіць пыл анучкай выціраць, а гэты конь — твой. Аднак ездзіць на ім ты можаш толькі па тэрыторыі гаражоў. Пра шашу і не думай. Вось калі споўніцца шаснаццаць, здасі на правы, тады — ездзь куды хочаш.

Але пакажыце мне цярплівае дзіця! Вось і сын Юрасіка цярплівасцю не славіўся. Выязджаў на сваім прыгажуне і ў горад, і за горад. Да пары да часу гэта яму сыходзіла з рук.

Аднак у гэтым месцы я хачу прыпыніць аповед пра «Ямаху», каб крыху расказаць вам пра самога Юрасіка.

Пачаў Юрасік свой бізнэс на голым месцы, з нуля, але праз некалькі гадоў стаў самым багатым чалавекам у горадзе, і гэтых самых нулёў на яго рахунку ў банку сабралася больш шасці. Да яго з задавальненнем ішлі на працу і звычайныя «рабацягі», і вядучыя спецыялісты. Але, што самае дзіўнае, працаваў Юрасік, што называецца, «без даху». Можа рэкецыры і крымінальныя аўтарытэты баяліся яго пудовых кулакоў, мо іх палохала тое, што ён першы ў горадзе дабіўся дазволу на нашэнне зброі для сябе і сваіх падначаленых, а мо проста нарадзіўся пад шчаслівай зоркай, аднак Юрасік, заплаціўшы падаткі, спаў спакойна.

Усе ў горадзе пра гэта ведалі. Ведалі і два сяброўкі-паліцэйскія — супрацоўнікі дарожна-паставой службы, якія даўно марылі прымусіць Юрасіка стаць іх кармушкай. Але тым марам не было суджана здзейсніцца, бо знайсці зачэпку аматарам лёгкай нажывы не ўдавалася. Але, як кажуць, надзея памірае апошняй. І гэтая надзея стала грэць іх сэрцы яшчэ больш, калі яны пранюхалі пра «Ямаху» няпоўнагадовага сына Юрасіка. І аднойчы ім падфарціла сустрэць яго ў горадзе:

— Правы, — патрабавалі ахоўнікі парадку.

— А ў мяне іх яшчэ няма, — адказаў хлопчык.

— Ну, калі няма, то сядай у машыну, а твой матацыклет загонім на штрафстаянку.

— Дзядзечка, — прасіўся сын Юрасіка, — давайце я сам на матацыкле паеду. Не буду ўцякаць. Чэснае слова.

— Маўчы, смаркач, — адказалі яму, — думаеш, калі ў нас не было багатага бацькі і гэткага матацыкла, дык на ім мы не здолеем і праехаць?

Чаму ж не здолеем. Паехалі. Але недалёка. На першым жа скрыжаванні праваахоўнік-кіроўца ўрэзаўся ў вугал дома. Як затым расказвалі відавочцы, прыехаўшая на месца здарэння спецслужба доўга не магла разабрацца, што належыць да матацыкла, а што да цела незадачлівага байкера.

У паліцэйскага ў дзяцінстве не было багатага бацькі. Яго ж дзеці цяпер не маюць ніякага.

Справа па здарэнні была спынена, як след і не пачаўшыся, бо напарнік загінулага расказаў следчаму і пра іх мэту, і пра папярэджванне хлопчыка аб хуткасці і манеўранасці матацыкла. Аднак Юрасік меў размову з пракурорам.

— Ведаеш, — адзначыў той, — пакараць ні цябе, ні сына мы не можам. Ды і сам ты здорава пацярпеў, бо матацыкл той рамонту не падлягае. Аб адным толькі магу цябе прасіць: дапамажы, чым можаш, сям'і загінулага.

І Юрасік дапамог. І пахаванне арганізаваў, і дзяцей узяў пад сваю апеку, бо маці іх пры жыцці мужа на «наркату падсеўшы» была, а пасля яго смерці зусім распусцілася...

— Не, ну, табе рабіць больш нама чаго! — усклікнуў я. — Ці ж твая віна, што ўсё так сталася?

— Мая не мая, а адказваць некаму трэба, — сказаў Юрасік і дадаў: — Прабач, але я спаць пайду, бо заўтра ў мяне дзелавая сустрэча.

Да мяне ж сон не ішоў, і я здранцвела застаўся сядзець ля стала. Вывела мяне з гэтага стану тупаценне босых ножак. А-а — самы меншанькі. Гэты ніколі не засне, дабранач не пажадаўшы. Гуллівa прытуліўся да мяне, а затым, пазіраючы ў вочы, спытаў:

— Тата, а калі я падрасту, ты мне купіш «Ямаху»?

— Ш-ш-то? — ледзь выціснуў я.

— «Ямаху» — сінтэзатар, як у дзядзькі Пеці.

Я з палёгкай уздыхнуў: гэты тэхнікай мала цікавіцца — больш музыкай.

— Вядома ж, куплю, — адказаў я і пацалаваў малога.

Праз некалькі дзён Юрасік зноў парадаваў сваім візітам. Ён зайшоў, загадкава ўсміхаючыся і нешта хаваючы за спінай.

— Ведаеш, — сказаў, прывітаўшыся, — я тады тваю размову з сынам выпадкова падслухаў... Карацей кажучы — вось, — і ён дастаў з-за спіны сінтэзатар фірмы «Ямаха».

Разабрацца ў падключэнні малому дапамог сам Юрасік і мой старэйшы сын. Аказалася, што ў сінтэзатары ёсць гатовыя мелодыі, нібы на магнітафоне запісаныя. Хлопчык націснуў адну са шматлікіх кнопак, і палілася мелодыя неўміручага «Бітлз» — «Yesterday». Я ажно заплакаў расчулена і падумаў: здаецца, аднолькавыя назвы, а адна рэч смерць прыносіць, лёсы калечыць, а другая жыццю радавацца прымушае.

Аўтар пра сваё апавяданне піша, што ўсё ў ім праўда, але «не без мастацкага прысвісту». Што тут дадаць? Толькі тое, што праўда без таго ж мастацкага прысвісту — прэсная. А творчасці прысвіст заўжды край як патрэбны. На маю думку, тут мы маем удалае спалучэнне праўды з прысвістам.

**Віктар КАЗЬКО.**

Карані

# Электронныя кнігі мінулых стагоддзяў

Магіляўчане могуць цяпер шукаць свае прозвішчы ў «Алфавітным спісе дваранскіх радаводаў, унесеных у радаслоўныя дваранскія кнігі Магілёўскай губерні». Спіс быў складзены ў 1909 годзе і надрукаваны ў Магілёве. Можа, сапраўды камусьці пашанцуе адшукаць у ім сваіх продкаў і дваранскія карані?..

Гэта кніга — адна з 43-х электронных копій рарытэтных асобнікаў, якія паступілі ў фонд Магілёўскай абласной бібліятэкі імя Леніна. Рэдкія выданні XIX — пачатку XX стагоддзя — каштоўныя крыніцы для

## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ ОБЪЕКТА ДОЛЕВОГО СТРОИТЕЛЬСТВА

**Заказчик-Застройщик – ОАО «Минскпромстрой».**

Зарегистрировано Минским горисполкомом решение № 698 от 20 июня 2000 года в едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100064639.

**Лицензия** № 02250/0464229, выдана Министерством архитектуры и строительства Республики Беларусь и действительна до 15 марта 2014 года.

**Адрес:** 220034, г. Минск, пер. Войсковой, 12.

**Режим работы:** понедельник – пятница $8^{45}$ – $17^{45}$ (обед $13^{00}$ – $13^{45}$), суббота $10^{00}$ – $14^{00}$ (без обеда), выходной – воскресенье.

Выполняя функции заказчика, в течение последних трех лет ОАО «Минскпромстрой» построены и введены в эксплуатацию объекты:

- жилой дом № 8 по ул. Тимошенко;
- жилые дома №№ 14, 16, 18 по ул. Бурдейного;
- жилые дома №№ 89, 91, 75 по ул. Притыцкого.

**Цель проекта** – Строительство объекта «Многоэтажный жилой дом № 7 по генплану со встроенными помещениями административно-общественного назначения и встроенно-пристроенным подземным гаражом-стоянкой в квартале улиц Притыцкого – Якубовского–Бурдейного–Якубовского в г. Минске» общей площадью 8 491,94 кв.м, в том числе общая площадь квартир – 6 986,94 кв.м.

Строительство будет осуществляться за счет средств физических и юридических лиц.

**Начало строительства – III квартал 2008 года.**

**Окончание строительства – I квартал 2010 года.**

**Месторасположение объекта** – Фрунзенский район г. Минска между микрорайонами «Запад-3» и «Кунцевщина», недалеко от станции метро «Каменная Горка», рядом с жилым домом № 18 по ул. Бурдейного.

Жилой дом запроектирован 13–17 этажей, 1 подъезд, 2 лифта, всего квартир – 95, из них: 1-комнатных – 24 шт., 2-комнатных – 42 шт., трехкомнатных – 28 шт., четырехкомнатных – 1 шт. В цокольном этаже размещаются 2 блока нежилых помещений административно-общественного назначения и гараж-стоянка на 31 машино-место. На первом этаже с отдельным входом снаружи расположено помещение Товарищества собственников. Предусмотрено помещение консьержа с рядом расположенным санузлом.

На дворовой территории предусматривается гостевая парковка автомобилей. Благоустройство внутридворовой территории предусматривает игровое оборудование для детей, пешеходные дорожки, озеленение.

В состав общего имущества по объекту входят: лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технический этаж и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механические, электрическое, сантехническое и иное оборудование общедомового назначения, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы инженерной инфраструктуры (в т.ч. внеплощадочные объекты инженерно-транспортного обеспечения дома), озеленения и благоустройства, помещение Товарищества собственников, помещение консьержа, встроенная водоповысительная насосная станция, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания.

**Конструкция здания** – монолитный каркас со стенами из блоков ячеистого бетона с поэтажным опиранием на перекрытия по безригельной схеме.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу 10.07.2006 г. № 1551-5/06, государственную экологическую экспертизу 16.05.2006 № 246-2006, получены положительные заключения КАиГ 10.05.2006 № 05-10/47Ф, Городского центра гигиены и эпидемиологии 24.04.2006 № 35-19вд/2506.

Получено разрешение Госстройнадзора № 2-208Ж-068/08 от 03.09.2008 г.

Участок площадью 0,6663 га передан ОАО «Минскпромстрой» на основании решения Мингорисполкома № 208 (п. 2) от 07.02.2008 года для строительства и обслуживания объекта в постоянное и временное пользование. Свидетельство о государственной регистрации земельного участка и возникновения права на него от 15.04.2008 г. № 500/756-2118.

Заключение договоров долевого строительства будет проводиться поэтапно, по неизменной на период действия договора цене объекта долевого строительства для всех категорий граждан. На дату опубликования декларации и по 1 мая 2009 г. к долевому строительству предлагаются:

- 14 квартир общей площадью 1205,83 м², расположенных на 3, 4, 6, 7, 8, 10, 13 и 15 этажах, а именно: однокомнатная квартира площадью 51,14 м² по цене 4200 тыс. руб. за 1(один) кв.м; двухкомнатные квартиры площадью 58,83 и 59,00 м² по цене 4200 тыс. руб. за 1(один) кв.м; двухкомнатные квартиры площадью 68,39; 76,61; 76,64; 82,75 и 82,97 м² по цене 3600 тыс. руб. за 1(один) кв.м; трехкомнатные квартиры площадью 91,61; 91,27 и 108,95 м² по цене 3900 тыс. руб. за 1(один) кв.м; четырехкомнатная квартира площадью 189,79 м² по цене 3300 тыс. руб. за 1 (один) кв.м;

- для физических лиц, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий предлагаются 14 квартир общей площадью 1061,90 м², расположенных на 2, 3, 4, 6, 8, 9, 11 и 12 этажах, а именно: однокомнатные квартиры площадью 41,54 и 51,14 м²; двухкомнатные квартиры площадью 59,00; 76,64; 82,75 и 83,44 м²; трехкомнатные квартиры площадью 91,01; 91,27 и 91,61 м² по цене 3467,292 тыс. руб. за 1(один) кв.м общей площади;

- 2 административных помещения полезной площадью 273,28 м², расположенных в цокольном этаже, а именно 224,5 м² по цене 7200 тыс. руб. и 48,78 м² по цене 7762,5 тыс. руб. за 1 (один) кв.м.

Заказчиком-застройщиком по строительству объекта выступает ОАО «Минскпромстрой». Функции генерального подрядчика исполняет один из филиалов Общества, выполняя при этом часть работ самостоятельно, а часть по субподрядным договорам со специализированными организациями.

**Более подробные сведения об объекте долевого строительства и ходом работ по его строительству можно получить по адресу: г. Минск, пер. Войсковой, 12, каб. 304 или по телефонам: 283 15 88; 283 15 78, +375 044 787 12 68 (Velcom).**

**Генеральный директор В.С. Нехай**

## ИЗВЕЩЕНИЕ

### о проведении 7 мая 2009 года аукциона

по продаже объектов недвижимости государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества

**ЛОТ № 1**

**Капитальное строение, инв. № 350/С-75086 и право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества.**

**Сведения о предмете аукциона:** одноэтажное здание общей площадью 107,6 кв.м.; стены каркасно-засыпные, обложены кирпичом; перекрытия – дощатые двойные, обшиты изоплитом. Год постройки – 1960.

**Местонахождение:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Светлая 2-я, д. 70.

**Условия использования** – под здания соцкультбыта или торгового назначения.

**Земельный участок – 0,0277 га. Срок аренды земельного участка 99 лет.**

**Начальная цена единого предмета аукциона – 35 886 284 рублей, в т.ч. имущества – 20 959 920 руб., права заключения договора аренды земельного участка – 14 926 364 руб.**

**Задаток, вносимый участником, – 1 000 000 рублей.**

**Продавец:** имущества – РУП «Фармация», тел. (0232) 40 09 94; права заключения договора аренды земельного участка – Гомельский горисполком, тел. (0232) 77 68 05.

**ЛОТ № 2**

**Капитальное строение, инв. № 342/С-32145 и право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества.**

**Сведения о предмете аукциона:** здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, 2-х этажное кирпичное здание, общей пл. 906,0 кв.м.; перекрытия – ж/б плиты; кровля – совмещенная; год постройки – 1986.

**Местонахождение:** Гомельская область, Светлогорский район, г. Светлогорск, ул. Заводская, д. 18.

**Условия использования** – для производственных, коммунально-складских целей.

**Земельный участок – 0,4028 га. Срок аренды земельного участка 50 лет.**

**Начальная цена единого предмета аукциона – 158 613 451 руб., в т.ч. имущества – 151 321 011руб.(стоимость снижена на 20 %), право заключения договора аренды земельного участка – 7 292 440 руб.**

**Задаток, вносимый участником, – 4 000 000 рублей.**

**Продавец:** имущества – РУП «Светлогорская фабрика художественных изделий», тел. (02342) 3 42 03, (017) 285 36 67; права заключения договора аренды земельного участка – Светлогорский районный исполнительный комитет, тел. (02342) 4 17 29.

**ЛОТ № 3**

**Кемпинг «Птичь»: капитальное строение (здание СТО со складом запчастей), инв. № 335/С-267; сооружение (навес 6 г), инв. № 335/С-278; сооружение (водонапорная башня), инв. № 335/С-274; сооружение (теплица), инв. № 335/С-270; капитальное строение (здание административное), инв. № 335/С-266; капитальное строение (здание гостиницы), инв. № 335/С-271; сооружение (навес 10 г), инв. № 335/С-277; сооружение (навес 5 г), инв. № 335/С-276; капитальное строение (здание сторожки), инв. № 335/С-11520; капитальное строение (овощехранилище), инв. № 335/С-268; капитальное строение (здание котельной и насосной), инв. № 335/С-273; капитальное строение (здание гаражей), инв. № 335/С-269; капитальное строение (здание хозяйственных построек), инв. № 335/С-265; и право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества.**

**Сведения о предмете аукциона:** здания одноэтажные, кирпичные и деревянные.

**Местонахождение:** Гомельская обл., Петриковский р-н, дер. Млынок, кемпинг «Птичь».

**Условия использования** – для содержания и обслуживания объектов социального назначения (объекты придорожного сервиса).

**Земельные участки: № 1 – 2,7069 га и № 2 – 0,2171 га. Срок аренды земельных участков - 50 лет.**

**Начальная цена единого предмета аукциона – 194 222 666 рублей, в т.ч. имущества – 190 955 567 рублей, право заключения договора аренды земельного участка – 3 267 099 рублей.**

**Задаток, вносимый участником, – 6 000 000 рублей.**

**Продавец:** имущества – государственное лесохозяйственное учреждение «Петриковский лесхоз», тел. (02350) 5 32 52, 5 22 84; права заключения договора аренды земельного участка – Петриковский райисполком, тел. (02350) 5 35 77.

**Организатор аукциона – фонд «Гомельоблимущество», г. Гомель, проспект Ленина, 3, контактные телефоны (0232) 74 90 27, 70 14 72.**

**Аукцион проводится 7 мая 2009 г. в 11.30 по адресу: г.Гомель, проспект Ленина, 3, 5 этаж, каб. 501. Документы для участия в аукционе принимаются до 4 мая 2009 г.**

Торги проводятся в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

**Желающим участвовать в аукционе необходимо в срок до 17-00 4 мая 2009 г.** заключить с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон и представить организатору аукциона следующие документы: заявление на участие в аукционе по установленной форме; заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающую внесение задатка за участие в аукционе, на счет организатора аукциона, указанный в извещении; нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации; юридическим лицом – доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем иностранного юридического лица или иностранного гражданина, лица без гражданства – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе участники или их представители предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Организатор аукциона вправе снять объект с торгов до объявления его проданным.

**Задаток перечисляется на расчетный счет фонда «Гомельоблимущество» № 3642927330048 в филиале № 300 АСБ "Беларусбанк" г. Гомель, код МФО 151501661, УНН 400243904. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гомель, проспект Ленина, 3, фонд «Гомельоблимущество», ком. 406, с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по рабочим дням по 4 мая 2009 г. включительно.**

**Заключительная регистрация участников – 7 мая 2009 г. с 10.30 до 11.15.**

Победитель аукциона в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполкомом решения о предоставлении ему земельного участка обязан внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, расходы, связанные с формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией создания земельного участка.

После совершения победителем аукциона названных платежей, но не позднее 2 рабочих дней, с ним продавцом имущества заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка. Оплата за приобретенный объект осуществляется в течение 30 календарных дней после подписания договора купли-продажи.

**Информация о продаваемых объектах расположена на сайте Гомельского облисполкома: www.gomel-region.by и сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь: www.gki.gov.by.**

## *ИНФОРМАЦИЯ о результатах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Белкотлоочистка» (г. Минск, ул. Аранская, 22А) за 2008 г.*

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2009 г.

млн. руб.

| Наименование показателя | Код строки | На начало года | На конец года |
|---|---|---|---|
| **АКТИВ** | | | |
| 1. Внеоборотные активы | 190 | 335 | 444 |
| 2. Оборотные активы | 290 | 1002 | 1182 |
| **БАЛАНС** | **300** | **1337** | **1626** |
| **ПАССИВ** | | | |
| 3. Капитал и резервы | 490 | 1044 | 1295 |
| 4. Обязательства | 510,690 | 293 | 331 |
| **БАЛАНС** | **700** | **1337** | **1626** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 2008 г.

| Наименование показателя | Код строки | За отчетный период |
|---|---|---|
| Выручка от реализации работ, услуг | 010 | 3845 |
| Налоги и сборы из выручки | 011 | 652 |
| Себестоимость работ, услуг | 030 | 2417 |
| Прибыль от реализации работ, услуг | 070 | 776 |
| Операционные доходы | 120 | 5 |
| Внереализационные расходы | 150 | 169 |
| Прибыль отчетного года | 240 | 612 |
| Налог на прибыль и иные обязательные платежи | 250-260 | 210 |
| Чистая прибыль | 300 | 402 |

**Директор М.М. Чикилев**

**Гл. бухгалтер С.В. Русак**

## ИЗВЕЩЕНИЕ

### о проведении 16 апреля 2009 года повторного аукциона

по продаже объектов недвижимости государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества

**ЛОТ №1**

**Здание магазина с подвалом, холодной пристройкой (инв. № 340/С-285085) и право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества.**

**Сведения о предмете аукциона:** одноэтажное кирпичное здание магазина с подвалом, общей пл. 445 кв.м., год постройки – 1953; деревянная холодная пристройка; кирпичный склад.

**Местонахождение:** Гомельская область, Речицкий район, дер. Озерщина, ул. Судостроительная, 23.

**Условия использования** – при условии капитального ремонта или реконструкции здания с благоустройством территории земельного участка, под объект розничной торговли; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта в срок, не превышающей 2 (двух) месяцев; осуществление строительства в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

**Земельный участок – 0,3467 га. Срок аренды земельного участка 55 лет.**

**Условия аукциона:** осуществление покупателем предпринимательской деятельности на данном объекте в течение не менее 5 лет с момента заключения договора купли-продажи,

создание не менее двух рабочих мест,

проведение капитального ремонта здания и благоустройство прилегающей территории не позднее двух лет от даты продажи,

запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объекта до выполнения им условий договора купли-продажи.

**Начальная цена единого предмета аукциона – 1 685 277 руб., в т.ч. имущества – 35 000 руб., право заключения договора аренды земельного участка – 1 650 277 руб.**

**Задаток, вносимый участником, – 168 000 рублей.**

**Продавец:** имущества – РУП ВП «Нижне-Припятское», тел.: (02351) 2 20 09, 2 32 60, права заключения договора аренды земельного участка – Речицкий райисполком, тел. (02340) 2 34 61.

**ЛОТ № 2**

**Капитальное строение (здание ПТО), инв. № 333/С-13385, и право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества.**

**Сведения о предмете аукциона:** одноэтажное кирпичное здание, общей площадью 60 кв.м, кровля совмещенная, год постройки 1996.

**Местонахождение:** Гомельская область, Калинковичский район, г.п. Озаричи.

**Условия использования** – под здание технического осмотра.

**Земельный участок – 0,1005 га. Срок аренды земельного участка 50 лет.**

**Условия аукциона:** осуществление покупателем предпринимательской деятельности на данном объекте в течение двух лет с момента заключения договора купли-продажи,

создание не менее одного рабочего места,

запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объекта до выполнения им условий договора купли-продажи.

**Начальная цена единого предмета аукциона – 823 410 руб., в т.ч. имущества – 35 000 руб., право заключения договора аренды земельного участка – 788 410 руб.**

**Задаток, вносимый участником – 80 000 рублей.**

**Продавец:** имущества – РДУП по обеспечению нефтепродуктами «Белоруснефть-Гомельоблнефтепродукт», тел. (0232) 90 94 95, права заключения договора аренды земельного участка – Калинковичский райисполком, тел. (02345) 3 15 60.

**ЛОТ № 3**

**Капитальное строение, инв. № 310/С-25730 и право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества.**

**Сведения о предмете аукциона:** одноэтажное здание с пристройкой и теневым навесом, общая площадь 878,1 кв.м., стены кирпичные и керамзитобетонные панели, перекрытия – плиты ж/бетонные. Год постройки 1982.

**Местонахождение:** Гомельская обл., Гомельский район, территория Гомельской ТЭЦ-2.

**Условия использования** – под административное здание, под производственное, для размещения экологически чистого производства, либо складского назначения.

**Земельный участок – 0,1803 га.** Земельный участок имеет ограничения в использовании площадью 0,0509 га, в том числе: в охранных зонах теплотрассы, водопровода, канализации – 0,0508 га, в охранной зоне электрокабеля напряжением до 1000В – 0,0001 га.

**Срок аренды земельного участка 99 лет.**

**Условия аукциона:** получить в установленном порядке разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта и начала строительства, иного освоения земельного участка в течение шести месяцев с момента возникновения права на земельный участок;

осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

